№ 22 (380) 11 чэрвеня 2004

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



### Газ за 46,68

Падпісаныя пагадненьні на пастаўку газу, Беларусь адмовілася ад «Транснафтапрадукту».

старонка 2

### Канская нечаканка

Мэтраў перамагло абсалютна першабытнае кіно. Назіраньні з Канаў.

старонка 2

### Аксана Новікава

Два з паловай году «хіміі» за неабвергнутыя факты.

старонка 4



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Чэкісты Лукашэнкі

Пераходзячы да Тозіка: працяг кнігі Аляксандра Фядуты.

старонка 9

### Магічная казка для нядобрых сноў

Гары Потэр і вязень Азкабану ў Менску.

старонка 13

### Партфэль

Ён транспартаваў у сабе буйныя сумы грошай. Ён нюхаў бутэрброды, пакладзеныя маёй клапатлівай жоначкай. Ён прысутнічаў на сакрэтных перамовах. Ён стаў маім сябром.

Літаратура —

старонка 15

### Баскетбалісты-мультымільянэры

ня ўмеюць накрэмзаць пары сказаў. Біл Косьбі ў рубрыцы «з усіх старон» —

старонка 11

# Дэпутаты набіраюць вагу



PHOTO.BYMEDIA.NET

## У падтрымку «Народнай волі»

**З ініцыятывы Народнай кааліцыі «Пяцёрка+» у чацьвер 10 чэрвеня а 18-й на Кастрычніцкай плошчы ў Менску адбудзецца акцыя «Ланцуг неабыякавых чытачоў» у падтрымку газэты, якую цкуюць судамі. Да акцыі, няма сумневу, далучацца чытачы і ўсіх іншых незалежных газэтаў з асобнікамі «Народнай волі» ў руках.**

## Балтыка зьмяніла жыцьцё

Пераможца леташняга конкурсу для падпісчыкаў «НН» Эльвіра Невяроўская ўсё сваё жыцьцё працавала ў школе настаўніцай малодшых клясаў. Цяпер яна пэнсіянэрка. Але ж паездка ў Палангу зьмяніла яе жыцьцё. «Да сёньня не магу адысьці ад убачанага. Тым і жыву». Мо таму спн.Эльвіра знайшла сабе новую працу: «Цяпер займаюся распаўсюдам білетаў ТЮГу ў школах». Запомніла Эльвіра Невяроўская праводзіны, на якіх фатограф газэты Андрэй Лянкевіч зьняў цэлую стужку. Для спн.Эльвіры падарожжа на Балтыку сталася падарункам да дня нараджэньня, таму яна зноў бярэ ўдзел у конкурсе: «Мо пашанцуе».

У «НН» Эльвіра Невяроўская пастаянна чытае эсэ, мастацкую частку наагул. Вершы, якія зьяўляюцца на старонках газэты, выразае і захоўвае. Асабліва спадабаўся ёй апошні верш Славаміра Адамовіча.

Каб выйграць падарожжа на Балтыйскае мора, выпісвайце «Нашу Ніву» на 2-е паўгодзьдзе 2004 году і дасылайце копію падпіснога абанэмэнту ў рэдакцыю. Падпісны індэкс 63125.

Балтыка чакае!

**Сяргей Трафілаў**

## «НАША НІВА» АБВЯШЧАЕ КОНКУРС ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ

Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры.

Дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Дасылаць можна й факсам на нумар (017) 284-73-29 або, адсканаваўшы, праз электронную пошту nn@promedia.by.

Падпісны індэкс 63125.

Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым уразdroб.



Дык падпісвайся!

# Галадоўку лёгка пачаць, але цяжка скончыць

Апазыцыя адным рухам перахапіла ініцыятыву. Чарговая акцыя пачалася экспромтам, хоць і выявіла тыпалягічную асаблівасьць нацыянальнае дэмакратыі часоў Лекашэнкі: дэмакратыя ў Беларусі галадае. Дэпутаты БНФ — Хадыка-Сіўчык — Адамовіч — ваўкавыскія таксысты — дэпутаты з «Рэспублікі»... З выказваньняў Скрабца ці Коласа ў першы дзень галадоўкі выглядае, што яны самі не ўяўлялі, што распачынаюць.

Але і ўлада не гатовая была рэагаваць. Хаатычныя «наезды» на галадоўнікаў у БТ, гадзінавыя справаздачы Папова ў радыё і Лукашэнкава «сам разьбяруся» — выразныя сьведчаньні разгубленасьці ўладаў і адсутнасьці адзінай узгодненай рэакцыі.

Партыі акцыю дэпутатаў падтрымалі, ня сталі гаварыць пра фальстарт, пра нелегітымнасьць палаты. Адзін вядомы дзяяч апазыцыі, праўда, выказаў што да галадоўкі скепсыс. «Ён не фігура, каб яго слухаць», — абрэзаў Уладзімер Парфяновіч. Груба, але зразумела. Маргінальныя фігуры маргіналізуюцца, іншыя набіраюць вагі, хоць і страчваюць кіляграмы.

Што такое посьпех галадоўкі? Гэта ўздым тэмпэратуры грамадзтва, уздым інтарэсу да палітыкі напярэдадні важных і доўгатэрміновых рашэньняў. Найперш — пра неканстытуцыйны трэці тэрмін Лукашэнкі і пра тое, якім будзе новы парлямэнт.

Галадаваньне праходзіць літаральна на вачах у людзей. Усё, чаго сёньня патрабуюць дэпутаты ад сваіх аднадумцаў — палітыкаў, журналістаў, усіх грамадзянаў, — гэта крэдыту даверу і, натуральна, падтрымкі. Ад гэтага сёньня залежыць сцэнар прынамсі пяці наступных гадоў нашага жыцьця.

**Барыс Тумар**

**Учынак прадстаўнікоў групы «Рэспубліка» пацьвярджае шчырасьць і сур'ёзнасьць таго, што яны рабілі й робяць, і дае шанец усяму грамадзтву, мяркуе дырэктар Беларускага ліцэю Уладзімер Колас. Старонка 4.**

# Старшыня Рады БНР падтрымала галадоўнікаў

**Старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла ў тэлефоннай гутарцы з дэпутатам Сяргеем Скрабцом выказала ад імя Рады БНР падтрымку дэпутатам-галадоўнікам і ўсім тым, хто далучыўся да гэтай акцыі пратэсту.**

# Салямонава рашэньне

## Газ за 46,68 пры нізкіх расцэнках за транзыт. «Захад-Транснафтапрадукт» аддалі Расеі.

8 чэрвеня ў Менску быў урэшце падпісаны кантракт паміж «Газпромам» і «Белтрансгазам». Паводле кантракту, Беларусь будзе атрымліваць газ па 46,68 даляры за тысячу кубамэтраў, а транзытная стаўка вызначаная на роўні 0,75 даляры за пракачку тысячы кубамэтраў газу на сто кілямэтраў. Нагадаем, што Ўкраіна ўсталявала вышэйшую транзытную стаўку — 1,02 даляры, але й плаціць за газ 50 даляраў за тысячу кубоў.

Паводле словаў кіраўніка ўраду Сяргея Сідорскага, прынятая цана на газ цалкам задавальняе беларускі бок: «Беларусь працуе па гэтай цане з пачатку году. За гэты час Рэспубліка Беларусь здолела адаптавацца да гэтых цэнаў». Прэм'ер распавёў, што ўмовы кантракту на 2004 год будуць базавымі пры абмеркаваньні кантракту на 2005 г., якое пачнецца неўзабаве. Расейскі прэм'ер Міхаіл Фрадкоў назваў такое разьвязаньне газавай спрэчкі кампрамісным.

У справе стварэньня супольнага газатранспартнага прадпрыемства на базе «Белтрансгазу», якога дамагаецца «Газпром», нічога новага не абвешчана — калі толькі вырашэньне газавай вайны не суправаджалася ніякімі сакрэтнымі пратаколамі.

Урад па-ранейшаму настойвае на тым, што «Белтрансгаз» каштуе 5 млрд даляраў, а «Газпром» прапануе за яго 600 млн. С.Сідорскі зноў падкрэсьліў, што можа быць праведзеная незалежная экспэртная ацэнка кошту прадпрыемства.

Для наданьня моманту дадатковае значнасьці, бакі падпісалі таксама дакумэнт аб праве ўласнасьці на нафтапрадуктаправоды, што цягнуцца праз тэрыторыю Беларусі. Міхаіл Фрадкоў адцеміў, што дзейнасьць «Захад-Транснафтапрадукту» будзе рэгулявацца паводле беларускага заканадаўства, пры тым прадпрыемства будзе знаходзіцца ва ўласнасьці расейскага боку.

Саступкі беларускага ўраду ў газавым пытаньні несувымерна большыя за саступкі «Газпрому», лічыць Валеры Дашкевіч, выканаўчы дырэктар ААТ «Белгазпрамбанк»: «З аднаго боку, Беларусь атрымала стабільную крыніцу газу, бо дагэтуль яна мусіла атрымліваць газ па мностве кантрактаў ад нібыта незалежных пастаўшчыкоў, якія, аднак, таксама мелі дачыненьне да «Газпрому». З другога боку, «Газпром» атрымаў тое, чаго найбольш хацеў — кантракт на пракачку газу праз Беларусь і амаль тую транзытную стаўку, што і хацеў мець. Гэта вельмі істотна: дагэтуль газ ішоў, можна сказаць, кантрабандна, бо ў сумленным бізнэсе ўсё грунтуецца на кантрактах і калі іх няма, то гэта вельмі кепска.

Беларусь атрымала ня тое, што хацела, напрыклад, не атрымала газу па расейскіх тарыфах. Калі ацэньваць памеры саступак, то «Газпром» пасtupіўся на перамовах недзе на 7—8%, а Беларусь адступіла на 30% ад сваіх патрабаваньняў. Такім чынам, вялікіх саступак з боку «Газпрому» я ня бачу.

Чаму Беларусь пайшла на саступку і ці былі тут палітычныя меркаваньні? Бясспрэчна, у шматгадзінай гутарцы Пуціна з Лукашэнкам былі закранутыя вельмі многія пытаньні, але якія канкрэтна пытаньні закранаціся — мы даведаемся хіба падчас прыватызацыі, назіраючы за паводзінамі беларускіх уладаў».

**СР**

# Год бяз Быкава

**18 чэрвеня** на філфаку БДУ а 10-й гадзіне — адкрыцьцё мэмарыяльнай шыльды, прысьвечанай памяці Васіля Быкава.

А 15-й гадзіне ў канфэрэнцзале Дому літаратараў адбудзецца сустрэча памяці з удзелам вядомых пісьменьнікаў.

**19 чэрвеня** на Маскоўскіх могілках з 13-й да 15-й гадзіны — ускладаньне кветак на магілу Васіля Быкава.

А 18-й гадзіне — вечарына ў Доме літаратара, прысьвечаная памяці Васіля Быкава

Чакаецца прыбыцьцё зь Фінляндыі гранітнага валуна — помніка паэту.

Імпрэза «Васіль Быкаў і Нямеччына» адбудзецца **25 чэрвеня** ў гістарычнай майстэрні на вуліцы Сухой у Менску. Ладзіцца яна нямецкай амбасадай. Беларускай грамадзкасьці будуць адкрытыя невядомыя старонкі жыцьця вялікага пісьменьніка.

Паводле амбасадара Гельмута Фрыка, Быкаў як ніхто іншы, у тым ліку ў беларускім грамадзтве, выступае адначасна як за крытычнае адлюстраваньне мінулага, так і за накіраваную ў будучыню гатовасьць да прымірэньня.

**МБ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**АБСЭ можа аказаць Беларусі такую падтрымку, якую яна пажадае. Пра гэта ў аўторак у Менску на сустрэчы з кіраўніцтвам палаты прадстаўнікоў заявіў дзейны старшыня АБСЭ — міністар замежных спраў Баўгарыі Саламон Пасі. Разам з тым, як лічыць Пасі, Беларусь павінна вызначыцца, ці гатовая яна прыняць гэтую падтрымку. Кіраўнік АБСЭ, які наведаў Менск 8—9 чэрвеня, знайшоў час і для сустрэчы з кіраўнікамі апазыцыі. На здымку — міністар замежных справаў Сяргей Мартынаў з палёгкай праводзіць Саламона Пасі.**

# Асалода і яшчэ раз асалода

**Сэнсацыяй на апошнім Канскім фэстывалі сталася перамога дакумэнтальнага і антыбушаўскага фільму Майкла Мура «11 верасьня па Фарэнгейту». Што за гэтым — кіно ці палітыка? Ці магчыма зьяўленьне беларускіх фільмаў у Канах? На пытаньні нашага карэспандэнта адказвае кінааналітык Ігар Сукманаў, заўсёднік Канскіх фэстаў.**

**Працяг на старонцы 12.**



AP

# Сярэдні амэрыканец

Слова «сярэдні» не абавязкова азначае шэры ці безаблічны. Часопіс «Time» у біяграфіі 40-га прэзыдэнта ЗША ўжывае гэты эпітэт тройчы. Рональд Рэйган нарадзіўся на Сярэднім Захадзе, у палітыцы адстойваў інтарэсы сярэдняе клясы і ў вачох выбарцаў быў тыповым сярэднім амэрыканцам. Можна яшчэ дадаць, што Рэйган быў даволі сярэднім актарам у кіно. Але гэтага ніяк ня скажаш пра ягонае акторства на сусьветнай палітычнай сцэне.

Цікава, што бацька Рэйгана быў паводле перакананьняў дэмакратам. Рэйган спачатку таксама сымпатызаваў дэмакратам, але праславіўся як адзін з найбольш выбітных рэспубліканцаў у гісторыі ЗША.

**Працяг на старонцы 6.**

• НАВІНЫ •

### Нацбанк за амністыю капіталаў

Нацыянальны банк Беларусі (НББ) ініцыюе прыняцьце нарматыўнага акту, скіраванага на правядзеньне эканамічнай амністыі капіталаў. Легалізоўвацца могуць сродкі, зробленыя законным шляхам, але з ухіленьнем ад выплаты, зь нявыплатай ці няпоўнай выплатай падаткаў, пошлін і ўхіленьнем ад выплаты мытных плацяжоў.

### Акцыя: помнік Каліноўскаму

Арганізацыя «Правы альянс» распачала збор подпісаў за ўсталяваньне ў Менску помніка Кастусю Каліноўскаму. Іх ужо сабрана больш за 500. Зварот старшыні «Правага альянсу» Юр'я Карэтнікава з гэтай нагоды быў накіраваны да прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

### Прыпыненая яшчэ адна газэта

Міністар інфармацыі Ўладзімер Русакевіч падпісаў загад аб прыпыненьні выхаду газэты «Рабочая солидарность» на тры месяцы. Падставай стала адсутнасьць у рэдакцыі юрыдычнага адрасу. Між тым юрыдычнага адрасу газэты не зацьвярджае гарвыканкам.

### У чыноўнікі — без судзімасьці

Палата прадстаўнікоў прыняла папраўку да Закону пра дзяржаўную службу. Цяпер асоба, якая мае судзімасьць за зьдзяйсьненьне злачынства, ня можа быць прынятая на дзяржслужбу. Такія абмежаваньні ўжо існуюць у Выбарчым кодэксе.

### Праекты: Адкрытая Беларусь

Латвійская арганізацыя Трансатлянтычнай дамовы (ЛАТО) пры фінансавай падтрымцы ЗША, Даніі і Нарвэгіі заснавала грамадзкую арганізацыю «Адкрытая Беларусь», якая ў чэрвені пачне выдаваць у Менску апазыцыйную газэту. Рабочая назва — «Открытая газета». У стварэньні арганізацыі «Адкрытая Беларусь» бяруць удзел латвійскія МЗС і Мінабароны, дацкія, нарвэскія і амэрыканскія партнэрскія арганізацыі, прадстаўнікі незалежнага друку Беларусі.

### Бэльгія: 4-дзённы працоўны тыдзень

Вельмі доўгі адпачынак прапануе зрабіць бэльгійскі прэм'ер, лібэрал Гі Вэрхофстат. Ён мяркуе, што ўсталяваньне чатырохдзённага працоўнага тыдня павысіла б канкурэнтаздольнасьць бэльгійскай вытворчасьці. У Бэльгіі трымаецца 38-гадзінны пяцідзённы тыдзень працы. Вэрхофстат прапануе захаваць 38-гадзінны працоўны тыдзень, але прапануе «падзяліць» яго на чатыры дні. Сябры Фэдэрацыі бэльгійскіх прадпрымальнікаў успрынялі прапазыцыю з энтузіязмам. Горай паставіліся прафсаюзы.

### Успаміны Барыса Кіта

У Германіі выходзіць кніга ўспамінаў Барыса Кіта — беларускага вучонага-эмігранта, акадэміка астранаўтыкі.

### 80 млн даляраў на опэру

Сёлета на рэканструкцыю беларускіх тэатраў выдаткавана 33 млрд рублёў, а на рэстаўрацыю Опэры плянуюць выдаткаваць больш як 80 млн даляраў.

**СТ; БелаПАН**

# Галадоўка на Казарменным

**Цэнтар беларускай палітыкі перамясьціўся на Казарменны завулак. Кватэра дэпутата Фралова стала гэтымі днямі сапраўдным штабам апазыцыі. Штовечар а 18-й сюды сьцякаюцца сымпатызанты і прыходзяць сьпяваць артысты. Тут гуртуюцца палітыкі. Тут дзяжураць журналісты і праваабаронцы. Тут хаваюцца ад затрыманьня актывісты АГП.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Дом на Казарменнай, 4 пертварыўся ў штаб апазыцыі. Зьлева направа: Сяргей Калякін, Ігар Баслык, Анатоль Лябедзька. Першы справа — Уладзімер Парфяновіч.**

На Казарменным ідзе новае зьлічэньне дзён — ад 3 чэрвеня, першага дня галадоўкі. Галадоўшчыкаў па чарзе штодзень аглядае доктар, які сочыць за іх здароўем. Настроеныя ўсе аптымістычна. Сяргей Скрабец да доктара не ідзе: свой стан ён ведае дасканала з 22-дзённай леташняй галадоўкі (тая, праўда, была для ўмацаваньня стану здароўя). У двары ўвечары зьбіраюцца прэс-канфэрэнцыі, пасьля якіх ніхто не сьпяшаецца разыходзіцца. Усё па-свойску: Фралоў у хатніх тапачках, усе ў гуморы і з жартамі.

Увечары тут гуртуюцца палітыкі, а таксама артысты. У аўторак, змабілізаваныя Аляксандрам Дабравольскім, для дэпутатаў сьпявалі Зьміцер Сідаровіч і Кася Камоцкая, якая, як выявілася, далёкая сваячка Ўладзімера Парфяновіча.

Самая нечаканая падтрымка прыйшла ад прадпрымальнікаў: прадпрымальніцкі лідэр Анатоль Шумчанка абвесьціў, што на 17 чэрвеня прызначана агульнанацыянальная забастоўка прадпрымальнікаў у падтрымку патрабаваньняў дэпутатаў.

Аўтобусік з амапаўцамі дзень і ноч дзяжурыць зь іншага боку будынку, але ўваход у кватэру вольны. Інфармацыйную падтрымку наладзілі АГП і «Малады фронт», а таксама праваабарончыя арганізацыі, прадстаўнікі якіх стала дзяжураць на Казарменным. Сяргей Скрабец уражаны далучэньнем да галадоўкі іншых людзей: «Мы ўвогуле не разьлічвалі на тое, што нехта будзе далучацца. З гэтай падтрымкай нам лягчэй. Значыць, ня ўсіх запужалі ў гэтай краіне».

Галадоўшчыкі ўвесь час трымаюць сувязь з калегамі-дэпутатамі, якія іх падтрымліваюць, і гатовы зьявіцца на паседжаньне, калі будзе разглядацца «іхны» законапраект. На пытаньне аб своечасовасьці пераходу да непарляманцкіх мэтадаў барацьбы Сяргей Скрабец адказвае: «Усе мэтады спрабавалі, нам не даюць выступаць. Калі нам адключаюць мікрафоны, калі майго памочніка не пускаюць у палату прадстаўнікоў — што гэта за праца?»

Пакуль што вечарамі на Казарменным зьбіраецца толькі сотня чалавек. Аднак падтрымка грамадзтва надае значэньне і сэнс акцыі, у якой напачатку многія бачылі толькі піяр.

**Мікола Бугай**

## Палата трохі паддалася

**8 чэрвеня палата прадстаўнікоў пад ціскам галадоўкі «рэспубліканцаў» усё ж уключыла ў павестку дня сэсіі законапраект аб унясеньні зьмяненьняў і дапаўненьняў у Выбарчы кодэкс. Праект пастаўлены трынаццатым пытаньнем пленарнага пасяджэньня 22 чэрвеня. Пры гэтым кіраўніцтва палаты распаўсюдзіла сярод дэпутатаў афіцыйны праект пастановы, у якім прапануецца «адхіліць праект закону».**

Менавіта беспадстаўная адмова Рады палаты вынесьці на разгляд сэсіі законапраект і стала непасрэднай прычынай галадоўкі трох «рэспубліканцаў», пераканаНы дэпутат ад Менскага раёну Ўладзімер Дзялендзік. Аднак такую форму пратэсту калегаў У.Дзялендзік лічыць няправільнай: «Галадоўкі нічога не даюць».

Кіраўнік дэпутацкае групы «Спрыяньне эканамічнаму разьвіцьцю» Кірыла Халопік ухіліўся ад ацэнкі праекту закону, спаслаўшыся на эканамічны характар сваёй дзейнасьці. На ягоную думку, праект «нічога не мяняе, бо ўтрымлівае касмэтычныя праўкі». Ён думае, што нават прыняцьце гэтых паправак ня зьменіць стаўленьня Захаду да прызнаньня нашых выбараў. Што да шанцаў прыняцьця закону (са 108 першапачатковых прапаноў засталіся тры прынцыповыя: адмена датэрміновага галасаваньня, пашырэньне правоў назіральнікаў ды ўвядзеньне ў склад выбарчых камісій прадстаўнікоў апазыцыі хоць бы з дарадчым голасам), дык Кірыла Халопік пераканаНы, што законапраект ня пройдзе.

**Глеб Хмяльніцкі**

## Галадоўка за дэмакратыю: хроніка

**3 чэрвеня** дэпутаты Фралоў, Скрабец і Парфяновіч абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту супраць неўнясеньня ў парадак работы сэсіі падрыхтаванага «рэспубліканцамі» законапраекту аб зьменах у выбарчае заканадаўства. Іншыя патрабаваньні — выпусьціць з турмы Міхаіла Марыніча і адмовіцца ад зьменаў у канстытуцыі аб трэцім тэрміне для Лукашэнкі. У звароце да дэпутатаў галадоўшчыкі заяўляюць, што гатовы разгледзець варыянт добраахвотнай адстаўкі Лукашэнкі і гарантаваць яму недатыкальнасьць, захаваньне маёмасьці, банкаўскіх рахункаў і вольны выезд з краіны.

У акцыі адчуваліся спантаннасьць, неарганізаванасьць і адсутнасьць за «рэспубліканцамі» агульнарэспубліканскай структуры. Спачатку дэпутаты начавалі на працоўных месцах у парлямэнце. Аднак пакольki Дом ураду быў блякаваны ахавай, дэпутаты перабраліся на кватэру да Фралова.

**4 чэрвеня** да галадоўкі далучыліся актывісты АГП Марына Багдановіч і Генадзь Ананьеў. **5 чэрвеня** — спроба разбіць намёты ў двары дому генэрала Фралова. АМАП зьнёс намёты, Марыну Багдановіч і Генадзя Ананьева часова затрымалі. Сябры АГП Уладзімер Чырвоненка і (6 чэрвеня) Юры Істомін далучыліся да галадоўкі. **5** і **6 чэрвеня** Валерыю Фралову двойчы выклікалі «хуткую». Лекар зафіксаваў перадынфарктны стан — у генэрала раней ужо быў інфаркт.

**7 чэрвеня** кватэру на Казарменным наведалі пасол АБСЭ Эбэргард Хайкен, паслы эўрапейскіх краінаў. Уночы з 7 на 8 чэрвеня камунальнікі зьнялі транспарант «За справядлівасьць. Не трэцяму тэрміну. Свабоду Марынічу» з балькону кватэры Фралова.

За транспарант у дачыненьні да Фралова заведзеная адміністрацыйная справа па артыкуле 143 ч.3 Адміністрацыйнага кодэксу за «самавольнае пераабсталяваньне, перафарбоўваньне бальконаў, лёджый і іншых архітэктурных элемэнтаў фасадаў жылых дамоў».

**8 чэрвеня** галадоўшчыкаў наведаў пасол ЗША Джордж Крол.

Раніцай затрыманыя шасьцёра маладафронтаўцаў, якія раздавалі каля Дому ўраду звароты галадоўшчыкаў да прадстаўнікоў сілавых структур, вэртыкальшчыкаў і дэпутатаў. У звароце — заклік дзейнічаць у рамках Канстытуцыі і здаровага сэнсу: «Самым заўзятым чыноўнікам… ня ўдасца пазьбегнуць адказнасьці. Таму прытрымлівайцеся закону і жывіце паводле сумленьня». Дэпутаты-галадоўшчыкі назвалі затрыманьне маладафронтаўцаў «незаконным» і папярэдзілі прадстаўнікоў улады аб адказнасьці за незаконныя дзеяньні. У галадоўшчыкаў зьвіўся ўласны інтэрнэт-сайт: www.inart.info. У першы ж дзень яго наведалі 837 чалавек.

На момант здачы нумару стала вядома, што 10 чэрвеня да галадоўкі далучыцца палацкі прадпрымальнік.

**ВДз**

# Блаславі Беларусь

Уладзімер Колас

Недзе на пачатку 70-х зьявіўся фільм амэрыканца Стэнлі Крамэра «Блаславі зьвяроў і дзяцей». У ім распавядалася пра групу дзяцей, якіх бацькі прывезьлі на вакацыі ў нейкі амэрыканскі дзіцячы летнік. Гэты летнік мала чым адрозьніваўся ад нашых «піянэрскіх лягераў», хіба толькі ўзроўнем камфорту. У астатнім усё было да болю знаёмым: тыя ж лінейкі з гучнымі траскучымі прамовамі, тыя ж важатыя і адміністрацыя, якія першымі парушалі лёзунгі, толькі што палымяна прамаўляныя з трыбуны, і тыя ж падлеткі, якія ўвішна паўтаралі за дарослымі хлусьню, а калі заставаліся без нагляду, то брудна лаяліся, палілі, зьдзекаваліся са слабейшых і рабілі ўсё іншае, чым і дагэтуль займаюцца падлеткі ў нашых школах ды летніках, цяпер ужо і ня вельмі хаваючыся ад дарослых.

Дык вось, дзеці, пра якіх распавядаў фільм, адрозьніваліся ад астатніх тым, што празь нейкія свае «заганы» яны не былі прынятыя ў агульную кампанію і трымаліся асобна.

Аднойчы ўвесь летнік пасадзілі на аўтобусы і павезьлі некуды далёка ў прэрыі наведаць цікавы атракцыён — папаляваць на бізонаў. Паляваньне адбывалася такім чынам: па загоне, агароджаным дротам, хадзілі бізоны і скублі траву. Любы наведвальнік за невялікую плату мог атрымаць стрэльбу з патронам і стрэліць у любога бізона. Потым за асобную плату ты мог сфатаграфавацца каля забітай жывёліны ці атрымаць яе скуру альбо галаву.

«Ненармальнасьць» герояў фільму праявілася ў тым, што, у адрозьненьне ад іншых, ім гэты атракцыён зусім не спадабаўся. Яны былі шакаваныя відовішчам, калі прыгожыя і магутныя жывёліны падалі на зямлю, абліваючыся крывёй, а іхнія сродзічы абыякава стаялі побач і, схіліўшы галовы, прагна скублі траву, не разумеючы, што вельмі хутка і іх напаткае такі самы лёс, і яны паваляцца на траву ад такой самай кулі.

Героі фільму вырашаюць выратаваць няшчасных жывёлін, і галоўная частка фільму па-галівудзку распавядае гісторыю іхніх уцёкаў зь лягеру, выкраданьня аўтамабіля, уцёкаў ад паліцыі ды бандытаў і г.д. Але фінал адрозьнівае гэты фільм ад безьлічы галівудзкіх камэрцыйных штампаў. Ён зусім не «шчасьлівы», але вельмі праўдзівы і вельмі бязьлітасны. Урэшце падлеткі выкрадаюць ключы ў вартаўніка, які сьпіць, адчыняюць браму агароджы, і бізоны, магутна тупаючы капытамі пад урачыстую музыку, бягуць з загону на волю. Але выраз шчасьця на тварах дзяцей раптам зьмяняецца на выраз зьдзіўленьня, а потым і роспачы. Агромністыя жывёліны, адбегшы на некалькі крокаў ад агароджы, раптам спыняюцца, схіляюць галовы і пачынаюць зноў прагна скубсьці траву…

Ім не патрэбна воля, іх не турбуе нават небясьпека заўчаснай пагібелі. Адзінае, што вызначае ўсё іхняе існаваньне, — гэта пастаяннае імкненьне жэрці, пастаянна напаўняць і вызваляць свае страўнікі.

Памятаю, як уразіў мяне гэты фільм у часы савецкага таталітарнага «застою». Чамусьці мне тады падалося дзіўным, што людзей у Штатах, краіне, як нам усім тады здавалася, абсалютна ідэальнай у пляне свабоды і дэмакратыі, могуць хваляваць тыя самыя праблемы, што хвалююць і нас. Падабенства сытуацыі, безумоўна, не абмяжоўвалася тым, што амэрыканскія бізоны вельмі падобныя да беларускіх зуброў. Уражвала трапнасьць знойдзенай Крамэрам мэтафары, якая адлюстроўвае вельмі важную адметнасьць чалавечай прыроды. Безумоўна, біялягічны абавязак перад сваім арганізмам лучыць нас з усім жывым і безь яго выкананьня мы проста ня можам існаваць. Але, з другога боку, менавіта гэтае імкненьне задаволіць у першую чаргу свае ўласныя фізычныя патрэбы, не зьвяртаючы ўвагі на тое, што робіцца навокал, не выказваючы пратэсту, калі навокал робіцца нешта шкоднае ня толькі асабіста для цябе, але і для супольнасьці, у якой ты жывеш, і стварае магчымасьць для ўзьнікненьня таталітарных і дыктатарскіх рэжымаў.

Па гістарычных мерках зусім нядаўна ўзьніклі і набралі моц людажэрныя сталінскі і гітлераўскі рэжымы, якія зьнішчылі мільёны бязьвінных людзей. Але што рабілі гэтыя людзі, калі тыя рэжымы толькі пачыналі паўставаць? Калі ўзьніклыя ніадкуль істоты ачмуралі масы нахабнай хлусьнёй, калі асьцярожна і паступова, па аднаму, пачыналі зьнішчаць тых, хто адрываў галаву ад штодзённай жуйкі, абвяшчаў пра агульную небясьпеку? Нехта «ўсё разумеў», але, разводзячы рукамі, пытаў: «А што я магу зрабіць?» — і рабіў урэшце ўсё, што яму загадвалі. Нехта сам імкнуўся «трапіць у сыстэму», каб прадацца даражэй і паесьці смачней. Але ўсе скончылі аднолькава.

Ці не паўтараецца з намі тое самае сёньня? Ці сапраўды гэты біялягічны абавязак перад уласным арганізмам настолькі магутны, што захінае сабой і наш розум, і нашу волю, і наша сумленьне, не даючы нам выканаць іншыя абавязкі — абавязак Чалавека, абавязак Грамадзяніна?

Так, наша цяперашняя сытуацыя адрозьніваецца ад таго, што адбывалася на пачатку мінулага стагодзьдзя. І нават ад таго, што адбывалася адносна нядаўна ў Югаславіі і зусім нядаўна — у Грузіі. У нас ня голад і не вайна. Дый рэжым наш яшчэ не наламаў такіх дроў, як, напрыклад, Мілошавічаў. Але дыктатура несумяшчальная з цывілізаванымі рынкавымі адносінамі, таму пры захаваньні такога рэжыму ўзровень жыцьця беларусаў у разы будзе адрозьнівацца ад суседзкага, а суседзі ня будуць наладжваць з намі нармальных адносінаў праз адыёзнасьць нашага рэжыму. Таму клясычная дыктатура, якая ствараецца ў Беларусі, у пэрспэктыве таксама ня зможа абысьціся бяз масавых рэпрэсій і бяз спробаў агрэсіі супраць суседзяў. У мінулым стагодзьдзі кумірам нашага цяперашняга рэжыму да пары да часу ўдавалася бліскуча праварочваць усе свае махінацыі дзякуючы нейкаму чароўнаму аслупяненьню міжнароднай цывілізаванай супольнасьці, якая проста не магла паверыць у магчымасьць такой нахабнай хлусьні і такіх неджэнтэльмэнскіх паводзінаў. Але сёньня з таго сумнага досьведу зроблены належныя высновы, і выпадак зь Мілошавічам красамоўна сьведчыць, што такія нумары ў Эўропе ўжо не праходзяць.

У дачыненьні да беларускага рэжыму Эўрапейскім Зьвязам таксама была выказана прынцыповая і адназначная пазыцыя. Аднак гэта зусім не азначае, што беларусы могуць спакойна жуваць сваю жуйку, чакаючы, што ўсё вырашыцца «само сабой». Прычым гэта тычыцца ня толькі шараговых грамадзянаў, але і многіх прадстаўнікоў нашай апазыцыі. Яшчэ ў мінулым годзе дэпутаты групы «Рэспубліка» выступілі з прапановай збору подпісаў за зьмены ў выбарчым заканадаўстве. Да іх далучыліся некаторыя іншыя прадстаўнікі грамадзкасьці, у тым ліку Міхаіл Марыніч, а таксама аўтар гэтых радкоў. Мы лічылі і лічым, што змаганьне супраць фальсыфікацый, за сумленныя выбары — гэта адзіная магчымасьць нешта зьмяніць мірным, цывілізаваным шляхам у нашым палітычным ладзе і ў нашым жыцьці. Але яшчэ год таму многія грамадзкія і палітычныя лідэры адмовіліся ад гэтай канкрэтнай справы, выставіўшы безьліч вельмі «слушных» і «мудрых» аргумэнтаў. Казалі, што згаданыя дэпутаты самі, так бы мовіць, не анёлы і трапілі ў «палатку» па сьпісе, і пра тое, што калісьці апазыцыянэры надта перапрацаваліся, зьбіраючы подпісы за імпічмэнт, а вынік аказаўся нулявым, і шмат што іншае. Праўда, не называліся ўголас такія матывы, як, напрыклад, нежаданьне аддаваць ініцыятыву новым дэмакратычным палітыкам, а таксама, магчыма, і нежаданьне нешта мяняць ва ўсталяваным рытме апазыцыйнай працы, які ўжо не аднойчы засьведчыў, мякка кажучы, невысокі ўзровень сваёй эфэктыўнасьці.

Такім чынам, з выбарчым заканадаўствам дагэтуль ня зроблена нічога, і мы поўным ходам ідзём на выбарчую кампанію, маючы перад сабой тыя ж камісіі, якія будуць нас рэгістраваць і лічыць нашы галасы нават не паводле існых законаў, а так, як загадаюць.

У гэтай сытуацыі рашэньне прадстаўнікоў групы «Рэспубліка» пра аб’яўленьне галадоўкі я расцэньваю як надзвычайны, але пасьлядоўны і мужны ўчынак, які пацьвярджае шчырасьць і сур’ёзнасьць таго, што яны рабілі і робяць.

Гэта — заклік да «дэпутатаў» нашага непрызнанага цывілізаванай міжнароднай і беларускай супольнасьцю «парлямэнту» — зрабіць хоць адзіны прынцыповы ўчынак, які б дапамог адкінуць двукосьсі з назваў нашага вышэйшага органу выбарнай улады і яго прадстаўнікоў. Гэта — шанец для Аляксандра Лукашэнкі, пакуль яшчэ ня позна, застацца ў гісторыі асобай, якая знайшла ў сабе мудрасьць і мужнасьць адмовіцца ад дыктатарскіх памкненьняў ды таталітарнай мэнтальнасьці крывавага мінулага і стаць на пазыцыі здаровага сэнсу, праўды і хрысьціянскай маралі. Гэта — заклік да ўсіх нас ахвяраваць сваімі амбіцыямі і сваім штодзённым спакоем ды рашуча, усім разам уголас абвясьціць нашу супольную волю.

Што яшчэ трэба, каб беларускае грамадзтва ўскалыхнулася, узьняло, нарэшце, галовы і навяло ў сваім доме парадак?

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ

9 чэрвеня судзьдзя Кастрычніцкага раёну Менску Ірына Басько прыгаварыла **Аксану Новікаву** да 2,5 гадоў абмежаваньня волі за «паклёп у адносінах да прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Прычына — улёткі, якія Новікава распаўсюджвала ў тунэлі станцыі «Менск-Пасажырскі». Там вялося пра датычнасьць вышэйшых службовых асобаў да зьнікненьня людзей у Беларусі. Сваёй віны Новікава не прызнае: «усе факты, выкладзеныя ў маіх улётках адпавядаюць сапраўднасьці, бо былі апублікаваныя і ніколі нікім не былі абвергнутыя». Выклікаць на просьбу Новікавай у якасьці сьведкаў Лукашэнку, Шэймана, Сівакова, Навумава суд адмовіўся. Спадарыня Аксана гадуе трохгадовую дачку, якую ня мае з кім пакінуць. Кажа, што возьме з сабою на «хімію».

25 траўня ў Лідзе аднаго з «зуброўцаў» затрымалі падчас расклейкі ўлётак зь лягатыпам «Зубра». Другога «зуброўца» затрымалі на месцы вучобы — у школе №14. 2 чэрвеня ў Менску затрымалі актывіста «Зубра» **Аляксея Ляўковіча**. Супрацоўнікі Заводзкага РУУС забралі яго з працоўнага месца на заводзе МАЗ. Пасьля допыту па справе, што тычылася надпісаў «Свабоду Марынічу!», яго адпусьцілі. 3 чэрвеня міністар інфармацыі падпісаў загад аб прыпыненьні на тры месяцы выхаду недзяржаўнага выданьня **«Рабочая солидарность»** на падставе адсутнасьці ў рэдакцыі юрыдычнага адрасу. Галоўны рэдактар «РС» Мікола Галко скіраваў Уладзімеру Русакевічу ліст з просьбай пераглядзець рашэньне. 6 чэрвеня ў цэнтры Менску былі затрыманы **журналісты** здымачнай групы расейскай тэлекампаніі **«Ren-TV»**, якія бралі інтэрвію ў двух сяброў моладзевага руху «Зубр» — **Кацярыны Клімко** і **Максіма Громава**, супраць якіх былі заведзены крымінальныя справы за палітычныя графіці «Свабоду Марынічу!». Разам зь імі быў затрыманы яшчэ адзін актывіст «Зубра» — **Яўген Афнагель**. Журналістаў і «зуброўцаў» затрымалі супрацоўнікі АМАПу ў цывільным, заявіўшы, што здымаць у цэнтры Менску можна толькі з дазволу Службы бясьпекі прэзыдэнта. 7 чэрвеня суд Першамайскага раёну Менску (судзьдзя Ананіч) адхіліў пазоў старшыні БХК **Тацяны Процькі** і яе мужа **Дзьмітрыя Козыра** да Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі і тэлежурналіста Ю.Пракопава. Пракурор Бярозаўскага раёну Мечыслаў Курыловіч адказаў на запыт **Юрася Губарэвіча**, дэпутата Белаазерскага гарсавету, што для правядзеньня сустрэчаў з выбаршчыкамі дэпутаты павінны браць дазвол у выканаўчай улады. Рашэньне раённага пракурора дэпутат зьбіраецца абскардзіць у абласной пракуратуры, бо лічыць, што парушаецца Закон «Аб статусе дэпутата». Днём раней каля Дому ўраду затрымалі сябраў «Маладога фронту», якія раздавалі дэпутатам зварот галадоўшчыкаў: **Зьмітра Дашкевіча, Мікіту Краснова, Насту Азарку, Аляксея Завідава, Паўла Фігірына, Сяргея Шынкевіча** і **Анатоля Фёдарава**.

**Сяргей Будкін**

# Палітыкі пра галадоўку

**Вячаслава Сіўчыка** можна ўбачыць на Казарменным завулку, 4, што над Сьвіслаччу ля станцыі мэтро «Першамайская», штодзень. «Я цалкам падтрымліваю гэтую акцыю. Гэта — апошняя зброя, каб дабіцца зьменаў у выбарчай сыстэме», — кажа сп.Вячаслаў.

На думку лідэра Партыі камуністаў **Сяргея Калякіна**, важна, каб пра акцыю дэпутатаў пачула як мага большая колькасьць людзей. «Пачула і падтрымала. Толькі салідарнасьць можа даць плён».

Старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** кажа, што ягоная партыя зьдзяйсьняе інфармацыйную падтрымку галадоўшчыкаў: зладзілі сустрэчу дэпутатаў з амбасадарамі, арганізавалі сюжэт на НТВ. Кіраўнік АГП папрасіў зусім юных сяброў партыі не браць непасрэднага ўдзелу ў галадоўцы. Тых жа, хто далучыўся да «рэспубліканцаў», ён цалкам падтрымлівае.

Дэпутат Белаазерскага гарсавету **Юрась Губарэвіч** гатовы ў любы момант далучыцца да акцыі. Намесьнік старшыні партыі БНФ **Алесь Міхалевіч** прыгадвае, як клалі здароўе ягоныя сябры на Украіне дзеля незалежнасьці, і захапляецца мужнасьцю ды рашучасьцю дэпутатаў.

У сваю чаргу, з крытыкай галадоўкі дэпутатаў выступае **Юры Беленькі**, намесьнік Пазьняка ў Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ: «Лічу гэта прафанацыяй з боку псэўдаапазыцыі. Вынікам гэтай акцыі можа стацца легітымізацыя палаты прадстаўнікоў, таму галадоўка ідзе на карысьць сёньняшняму ўраду».

Зь іншых пазыцый крытыкуюць акцыю дэпутаты-лукашэнкаўцы. **Сяргей Касьцян** называе галадоўку «правакацыяй»: «Прыедзе старшыня АБСЭ Саламон Пасі, вось і ўсчалі шум». Сяргей Касьцян ня бачыць патрэбы ў зьменах Выбарчага кодэксу.

Тым часам шэрагі галадоўшчыкаў растуць: сьледам за чатырма сябрамі АГП да дэпутатаў у аўтарак далучыліся намесьнік старшыні Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** і старшыня Пружанскай раённай арганізацыі АГП **Уладзімер Радзівончык**.

**Сяргей Будкін**

## КОШТЫ

**Рэклямныя расцэнкі на платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16:**
да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

# Ад галадоўкі да галадоўкі

## За Лукашэнкі яны сталі нацыянальным спосабам адстойваць правы

Алег Гардзіенка

Дата першай галадоўкі эпохі Лукашэнкі вядома дакладна — 4 студзеня 1995 г. Двума днямі раней Адміністрацыя прэзыдэнта забараніла «Беларускаму Дому друку» падаўжаць дамовы на друк «Свабоды», «Белорусской деловой газеты», «Фемиды», «Газеты Андрея Климова». 4 студзеня на Плошчу Незалежнасьці людзі выйшлі выказаць пратэст. Акцыя была жорстка разагнана АМАПам (дарэчы, гэта была першая акцыя, разагнаная пры Лукашэнку), а сп.Савіцкі моцна зьбіты і ў той жа дзень асуджаны судом Савецкага раёну сталіцы на пяць сутак адміністрацыйнага арышту за хуліганства. У прыёмніку-разьмеркавальніку прафэсар абвясьціў галадоўку. Гэта напалохала ўлады — і Менскі гарадзкі суд перагледзеў справу навукоўца. Выкладчыка вызвалілі.

Самая вядомая сталася галадоўка дэпутатаў Вярхоўнага Савету XII скліканьня, абвешчаная 11 красавіка 1995 г. Дэпутаты фракцыі БНФ пратэставалі супраць ухваленай астатнімі парлямэнтарамі ініцыятывы прэзыдэнта правесьці рэфэрэндум, дзе сярод іншага прапаноўвалася зьмяніць сымболіку краіны і надаць расейскай мове статус другой дзяржаўнай. Да дэпутатаў зьвярнуўся Зянон Пазьняк. Ён сказаў: «Вычарпаўшы ўсе магчымасьці, у знак пратэсту супраць антызаконнасьці і згубнасьці вашых дзеяньняў мы аб'яўляем галадоўку тут, у цэнтры залі. Пачынаем яе цяпер, з гэтае хвіліны. Мы патрабуем выкананьня Канстытуцыі, законаў Рэспублікі Беларусі, свабоды слова і ліквідацыі цэнзуры, спыніць рабаваньне народу і бацькаўшчыны». Галадоўку абвясьцілі З.Пазьняк, С.Антончык, Л.Баршчэўскі, Ю.Беленькі, І.Гермянчук, В.Голубеў, Б.Гюнтэр, Л.Дзейка, У.Заблоцкі, Л.Зданевіч, М.Крыжаноўскі, М.Маркевіч, В.Малашка, С.Навумчык, С.Папкоў, П.Садоўскі, А.Трусаў, А.Шут.

Дэпутаты ўладкаваліся проста ля трыбуны ў Авальнай залі. А другой ночы ў залю ўварваліся спэцназаўцы ў камуфляжы ды чорных масках і жорстка зьбілі дэпутатаў, выкінуўшы іх з Дому ўраду. На наступны дзень Васіль Быкаў зазначыў: «Краінай кіруе хунта». Дэпутацкія захады пакараць вінаватых у гэтай расправе, звароты ў суд так і засталіся марнымі. Да таго ж Лукашэнка колісь паабяцаў паказаць па тэлевізіі касэту, дзе зафіксавана зьбіцьцё парлямэнтароў. Абацянага чакаем ужо дзявяты год.

Наступныя галадоўкі прыпалі на «гарачую вясну» 1996 г. Зь іх вылучаецца акцыя лідэраў БНФ Юр'я Хадыкі і Вячаслава Сіўчыка, якіх утрымлівалі на Валадарцы, абвінавачаных у «арганізацыі або актыўным удзеле ў групавых дзеяньнях, якія парушалі грамадзкі парадак».

28 красавіка палітвязьні абвясьцілі галадоўку. Сіўчык трымаў яе 18 дзён, прафэсар Хадыка — 24 дні. Сіўчык з турэмных нараў праз пагаршэньне стану здароўя нават трапіў у турэмны шпіталь пад кропельніцу. Хадыку і Сіўчыка выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе, а справу пазьней фактычна спусьцілі на тармазах.

Абвяшчалі галадоўку і тыя, хто атрымаў «звычайныя суткі» і сядзеў увесну 1996 г. на Акрэсьціна, — палітыкі Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, журналіст і, між іншым, сёньняшні прэс-сакратар групы «Рэспубліка» Ўладзімер Дзюба. Трымалі галадоўку і сябры УНА-УНСО, якім «шылі» крымінал у арганізацыі масавых беспарадкаў, — Вячаслаў Гоч, Андрэй Шаптыцкі, Сьцяпан Мярцалаў, Андрэй Міранюк.



PHOTO.BYMEDIA.NET

1995 год. Галадоўка ў Вярхоўным Савеце.

5 чэрвеня 1996 г. абвясьціў сухую галадоўку ў сьледчым ізалятары КДБ паэт і журналіст Славамір Адамовіч, які сядзеў ужо трэці месяц за верш «Убей президента». Галадоўка была аб'яўлена ў знак пратэсту «супраць інфармацыйнай ізаляцыі, тэндэнцыйнасьці сьледчых і самой меры стрыманьня». Акцыя доўжылася восем дзён, пры канцы яе Адамовіч трапіў у турэмны шпіталь.

У 1997 г. галадаў тагачасны вязень гарадзенскага ізалятару часовага ўтрыманьня журналіст ОРТ П.Шарамет, затрыманы ў ліпені таго году за спробу пераходу беларуска-літоўскай мяжы. Карэспандэнт патрабаваў сустрэчаў з роднымі, газэтаў, тэлевізар у камэры.

1 сакавіка 1999 г. у Менску быў затрыманы старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах прэзыдэнта РБ Віктар Ганчар. Якраз мусілі пачацца незалежныя выбары прэзыдэнта. Ганчар быў асуджаны на 10 сутак судом Ленінскага раёну за парушэньне правілаў правядзеньня сходаў. У прыёмніку-разьмеркавальніку палітык абвясьціў галадоўку.

27 ліпеня таго ж году падчас сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці быў затрыманы лідэр БСДП Мікола Статкевіч, на яго была заведзена крымінальная справа за арганізацыю беспарадкаў. Палітык абвясьціў галадоўку і праз некалькі дзён быў выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

15 кастрычніка 2000 г. у Жабінцы галадаў на сваім выбарчым участку назіральнік за выбарамі Генадзь Самойленка. Падстава — шматлікія факты парушэньняў Выбарчага кодэксу і Канстытуцыі на Мухавецкім выбарчым участку №13.

12 сакавіка 2001 г. кандыдат у дэпутаты палаты прадстаўнікоў па Берасьцейскай-заходняй акрузе №3 Сяргей Вакуленка абвясьціў сухую галадоўку супраць парушэньняў з боку ўладаў падчас выбарчай кампаніі. Яна была непрацяглаю.

У траўні 2001 г. 14 дзён галадала старшыня незалежнага прафсаюзу бабруйскае «Белшыны», інвалід трэцяе групы Алена Захожая. Падстава — нежаданьне адміністрацыі заводу даць юрыдычны адрас нізавой арганізацыі незалежнага прафсаюзу. На пятнаццаты дзень жанчына была шпіталізаваная, а Бабруйскі гарвыканкам паабяцаў вырашыць пытаньне зь юрыдычным адрасам, нават калі «Белшына» адмовіцца гэта рабіць.

У лістападзе 2001 г., адразу пасьля затрыманьня ў Камітэце дзяржкантролю і зьмяшчэньня ў сьледчы ізалятар ГУУС Менгарвыканкаму, аб'явіў галадоўку дырэктар ЗАТ «Атлянт» Леанід Калугін. Акцыя трывала крыху болей за суткі. З прычыны пагаршэньня стану здароўя экс-кіраўнік заводу лядоўняў вымушаны быў адмовіцца ад акцыі.

З 5 да 15 красавіка 2002 г. у Горадні галадаў журналіст газэты «Навінкі» Стась Пачобут, які атрымаў 10 сутак арышту за пікет, праведзены ў падтрымку журналістаў закрытай уладамі газэты «Пагоня» М.Маркевіча і П.Мажэйкі. «Свабода слова вартая гэтай галадоўкі», — сказаў па выхадзе на свабоду С.Пачобут.

17 траўня 2003 г. у Магілёве, на пляцоўцы ля палацу культуры заводу штучнага валакна, абвясьціў галадоўку жыхар вёскі Зімніца Магілёўскага раёну Павал Крушкін. Некалькі гадоў таму ён быў падмануты падчас набыцьця мікрааўтобуса «Форд» на суму 1950 даляраў, але не знайшоў праўды ў шматлікіх інстанцыях. На шосты дзень да Крушкіна далучылася жонка. Але 28 траўня муж і жонка спынілі акцыю. Акцыя не прынесла вынікаў: ні ўлады, ні праваахоўныя органы не ўдзялілі селяніну патрэбнае ўвагі.

А вось галадоўка ў Ваўкавыску з 11 да 30 кастрычніка 2003 г. трыццаці таксоўшчыкаў, якія пратэставалі супраць канфіскацыі падатковай інспэкцыяй 13 мікрааўтобусаў, што належалі кіраўніку фірмы «Радыётаксі-22222» Мікалаю Аўтуховічу, і пазбаўленьня Міністэрствам транспарту і камунікацый ліцэнзіі на аўтамабільныя перавозкі, прынесла плён. Улады ўрэшце адступіліся, і машыны былі вернуты. Але ў траўні гэтага году Аўтуховіч заявіў, што падаткавікі ўзмацнілі націск на яго і ягоных партнэраў.

У лютым гэтага году абвясьцілі галадоўку, пратэстуючы супраць самавольства гарадзкіх уладаў, 17 прадпрымальнікаў віцебскіх рынкаў, затым іх колькасьць павялічылася да трыццаці двух. Прадпрымальнікі патрабавалі адмены пастановы Віцебскага гарвыканкаму, паводле якой крытыя рынкі гораду былі прыраўнаваныя да гандлёвых цэнтраў, а месцы на рынках — да крамаў. У выніку частка тавараў трапіла пад вэта на рэалізацыю, а продаж астатняга асартымэнту павінен быў весьціся праз падсумоўвальныя касавыя апараты. Прадпрымальнікі перамаглі: пастанова гарадзкіх уладаў была адменена і канфлікт часова замарожаны..

З 22 да 31 сакавіка праводзілася галадоўка дзесяці работнікаў ТАА «Юкі» ў Смалявічах. Супрацоўнікі гэтага будаўнічага прадпрыемства галадалі, выступаючы супраць імкненьня смалявіцкіх уладаў забраць зямлю, на якой месьцілася прадпрыемства. Акцыя была спынена пасьля таго, як да галадоўшчыкаў зьвярнуўся старшыня Менскага сталічнага саюзу прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімер Карагін. Аднак справа зь зямельным участкам так і завісла ў паветры і канчатковага рашэньня па «Юкі» прынята не было.

Галадоўкі ў Беларусі абвяшчаюць тады, калі вычарпаны ўсе астатнія формы пратэсту, калі ніякія заявы, просьбы, юрыдычныя намаганьні не даюць плёну. Тады і йдзе ў ход апошняя форма спадзеву на справядлівасьць — галадоўка. Праблема ў тым, што яна таксама не заўсёды вядзе да перамогі.



УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

**1996 год. Юзэфа Адамовіч у часе турэмнае галадоўкі сына Славаміра.**

# Нармандзкія інтрыгі

**Што і казаць, няпростыя задачы стаялі перад францускім прэзыдэнтам Жакам Шыракам падчас арганізацыі прызначанага на 6 чэрвеня сьвяткаваньня 60-годзьдзя высадкі дэсанту антыгітлераўскае кааліцыі ў Нармандыю.**

Выбар запрошаных на ўрачыстасьці гасьцей мусіў недвухсэнсоўна прадэманстраваць замежнапалітычныя прыярытэты Францыі, а праграма сьвята не павінна была стацца дапамогай амэрыканскаму калегу Бушу ў ягонай прэзыдэнцкай кампаніі. Зь першай задачай Шырак справіўся бліскуча, другой рады ня даў.

Сьпіс гасьцей, запрошаных на сьвяткаваньні ў Нармандыі, прыцягнуў увагу з трох нагод: сярод запрошаных краін не было Італіі і ўпершыню прысутнічалі Нямеччына і Расея. Незапрашэньне італьянскага прэм'ера Бэрлюсконі інакш як зьнявагай партнэра па Эўразьвязе не назавеш. Папраўдзе ж, замежнапалітычная вага Італіі не такая ўжо і малая — краіна была сярод заснавальнікаў Эўразьвязу і ўваходзіць у «вялікую шасьцёрку» самых магутных індустрыяльных дзяржаў. Але ж, відаць, у апошні час гэты свой уплыў кансэрватыўны ўрад Бэрлюсконі выкарыстоўваў у непажаданым для Парыжу кірунку. Італія не ўзяла пад казырок пасьля гучнага францускага загаду «Маўчаць!» узімку 2003 г. і насуперак жаданьню афіцыйнага Парыжу падтрымала ваенную апэрацыю Злучаных Штатаў у Іраку.

Нават пасьля таго, як групу краін — саюзьніц Амэрыкі пакінула Гішпанія, дзе сацыяліст Сапатэра, выконваючы папулісцкія перадвыбарныя абяцаньні, аднабакова і пасьпешліва вывеў гішпанскія войскі з Іраку, Італія застаецца вернай стратэгічнаму партнэрству з Амэрыкай. Такая прынцыповая пазыцыя італьянскага прэм'ера, які, нягледзячы на ўсё большыя антыамэрыканскія настроі сярод італьянскіх выбаршчыкаў, не апускаецца да падмены замежнае палітыкі голым папулізмам, зразумела, ня можа захапляць францускіх урадоўцаў. Прадэманстраваць суровае стаўленьне Парыжу да Бэрлюсконі і мусіла незапрашэньне Італіі на ўрачыстасьці ў Нармандыі. Вось і давялося Бушу, каб не падводзіць саюзьніка, перад сваім прыездам у Францыю наведаць Рым, дзе, акрамя сустрэчы з Бэрлюсконі, адбылася аўдыенцыя Буша ў Яна Паўла II.

Запрашэньне Нямеччыны ў асобе канцлера Шродэра на сьвята ў Нармандыі, як і чакалася, выклікала найбольш супярэчлівую рэакцыю. Так, брытанская прэса паставіла пад сумнеў мэтазгоднасьць знаходжаньня нямецкае дэлегацыі ў Нармандыі, «пакуль жывы хоць бы адзін брытанскі вэтэран». Дый у самой Нямеччыне да афіцыйнага ўдзелу ў сьвяткаваньні паставіліся неаднaзначна. Як-ніяк, папярэдні канцлер ФРГ Коль ад такога ўдзелу адмовіўся: маўляў, адкрыцьцё другога фронту для Нямеччыны ня зьяўляецца падставай для сьвяткаваньняў. Яшчэ большае непаразуменьне выклікала адмова кіраўніка цяперашняга левацэнтрысцкага ўраду краіны Шродэра наведаць нямецкія вайсковыя могілкі ў Нармандыі — паводле некаторых крыніц, «з павагі да гаспадара сьвята». Ну што ж, з тае самае «павагі да гаспадара» чырвона-зялёны ўрад Шродэра падчас свайго кіраваньня пасьпеў перакрэсьліць шмат якія асноватворныя прынцыпы замежнае палітыкі пасьляваеннае Нямеччыны. Так, трансатлянтычнае партнэрства са Злучанымі Штатамі адсунута на другі плян на карысьць сяброўства з Францыяй, яшчэ зусім нядаўна цёплыя і шчырыя польска-нямецкія стасункі ляжаць у руінах, а на былой рэпутацыі Нямеччыны як адваката малых краін Эўразьвязу можна паставіць крыж. Цяпер вось і найпершы абавязак кіраўніка дзяржавы — наведаць пахаваньні суайчыньнікаў, якія загінулі ў акопах другое сусьветнае вайны, — пастаўлены пад сумнеў. Ніколі яшчэ з часоў утварэньня Фэдэратыўнае Рэспублікі не была замежная палітыка Нямеччыны такой аднабаковай і апартуністычнай. Але ж, як выглядае, варта чакаць новых ахвяр на карысьць француска-нямецкага тандэму.

Што ж да запрашэньня расейскага прэзыдэнта Пуціна, дык яно, як і можна было чакаць, тлумачылася «невымернымі ахвярамі, якія панёс Савецкі Саюз у другой сусьветнай вайне». Быццам бы гэта менавіта Расея тры гады стагнала пад нацысцкай акупацыяй і страціла кожнага чацьвёртага свайго жыхара. Але ж сам факт удзелу крамлёўскіх прадстаўнікоў у сьвяткаваньнях у Нармандыі — своеасаблівая падзяка расейскім сябрам за іх салідарнасьць з Францыяй (прыгадайма неаднаразовыя сустрэчы Шырака, Шродэра і Пуціна, якія падаваліся як супацьвага сустрэчам Буша з брытанскім і гішпанскім прэм'ер-міністрамі Блэрам і Азнарам). Пры гэтым афіцыйны Парыж не турбуе, што Крэмль успрымае такія запрашэньні як «карт-блянш» на далейшы ўціск грамадзянскае супольнасьці і вольнае прэсы ў самой Расеі.



Жак Шырак не запрасіў на сьвята Бэрлюсконі, але запрасіў Шродэра й Пуціна.

Але ж, зразумела, самым важным госьцем францускага прэзыдэнта быў ягоны амэрыканскі калега. Пікантнасьць сытуацыі палягала ў тым, што гэткія сустрэчы выбіваюць найгалоўнейшы перадвыбарны козыр Бушавага апанэнта Керы пра адказнасьць Буша за нібыта ізаляцыю Злучаных Штатаў на міжнароднай арэне. Ні для кога не сакрэт, што «ўся прагрэсіўная грамадзкасьць» Заходняе Эўропы з надзеяй пазірае на Керы як на будучага амэрыканскага прэзыдэнта. З тае прычыны ўсё, што шкодзіць Бушу, успрымаецца ў Заходняй Эўропе зь дзіцячым энтузіязмам. Але ж адмовіцца ад запрашэньня Буша ў Нармандыю не выпадала. Ён, як-ніяк, пакуль што афіцыйны прадстаўнік краіны, якая цаной немалой колькасьці жыцьцяў сваіх грамадзян выратавала Францыю і ўсю Заходнюю Эўропу ад гітлераўскае няволі. Несумненна, іміджу Буша яго ўдзел у такіх міжнародных імпрэзах будзе дарэчы. Дый амэрыканскія справы ў Іраку, здаецца, не зусім адпавядаюць жудаснай карціне, маляванай электроннымі СМІ. Дадамо сюды эканамічны ўздым і паляпшэньне сытуацыі на рынку працы ў самой Амэрыцы — і Бушавы шанцы на пераабраньне пачынаюць выглядаць цалкам рэальнымі. Такім чынам, шмат хто ў Заходняй Эўропе, прачнуўшыся трэцяга лістапада і даведаўшыся пра вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Амэрыцы, можа нечакана ўсьвядоміць, што наступныя чатыры гады на афіцыйныя імпрэзы давядзецца запрашаць усё таго ж амэрыканскага прэзыдэнта. Так што ў сучаснай палітыцы пытаньні міжнароднага супрацоўніцтва не вырашаюцца паводле сталінскага прынцыпу «Няма чалавека — няма праблемы». Ні Амэрыка, ні Эўропа ня ў стане знайсьці адказы на выклікі часу паасобку. Трансатлянтычнае партнэрства патрабуе сур'ёзнага рамонту, інакш пра наступства «заходняя цывілізацыя» хутка можна будзе казаць толькі ў прошлым часе.

**Сяржук Вінаградаў**



# Сярэдні амэрыканец

Працяг са старонкі 2.

У гады «вялікай дэпрэсіі» Рональд зарабляў 100 даляраў за тыдзень у якасьці спартовага камэнтатара на радыёстанцыі «Who». Калі ён здымаўся ў кіно — часьцей за ўсё ў ролях каўбояў, — ягоны заробак у сярэднім складаў 3500 даляраў. Гэта было ня так і шмат, нават на тыя часы. Нічога дзіўнага, што Рэйган апынуўся ў шэрагу прафсаюзных актывістаў, абаронцаў правоў шараговых кінаактораў. Гэты факт, праўда, ніяк не паўплываў у будучыні на рашэньне прэзыдэнта Рэйгана разагнаць прафсаюз авіядыспэтчараў, які спрабаваў арганізаваць страйк у нацыянальных аэрапортах. Ён праводзіў у жыцьцё палітыку скарачэньня падаткаў і адначасова — скарачэньня дзяржаўнай падтрымкі пэўных катэгорыяў насельніцтва. Такая палітыка атрымала назву «рэйганомікі».

Але савецкім людзям Рональд Рэйган запомніўся ў першую чаргу як аўтар ідэі «зоркавых войнаў» (кансультант — Джордж Лукас?) ды словаў «Ёсьць рэчы, важнейшыя за мір». Савецкі Саюз, які нахабна, на вачох сусьветнае супольнасьці ўлез у Аўганістан, ён асьмеліўся назваць «імпэрыяй зла». Бескампрамісная палітыка Рэйгана адносна «брэжнеўскай дактрыны», на падставе якой адбылася інтэрвэнцыя ў Чэхаславаччыну ў 1968-м, прымусіла савецкае кіраўніцтва адмовіцца ад ідэі паўтарыць падобны сцэнар у 1980-м у Польшчы, ахопленай страйкамі. ЗША пры Рэйгану без ваганьняў увялі войскі на Грэнаду, каб спыніць экспарт кубінскае рэвалюцыі, падтрымлівалі «контрас» у Нікарагуа й душманаў у Аўганістане. Усё гэта дало падставу папярэдніку Рэйгана дэмакрату Картэру, які некалі прайграў яму на выбарах, цяпер, у гэтыя жалобныя дні, назваць свайго былога суперніка адным з найвялікшых амэрыканскіх прэзыдэнтаў.

На пачатку 80-х Рэйганам палохалі дзяцей — у літаральным сэнсе. У школе дзецям кожнага дня, як на вайне, дакладалі, дзе й колькі ракет сярэдняга радыюсу дзеяньня «Пэршынг» паставілі амэрыканцы ў Заходняй Эўропе. Колькасьць гэтых ракет, а таксама падлётны час трэба было ведаць, каб прайсьці грамадзка-палітычную атэстацыю. А потым Рэйган раптам сустракаецца з Гарбачовым. Некалькі сустрэч — і вось ужо гатовая дамова аб скарачэньні наступальных стратэгічных узбраеньняў і аб вывадзе ракетаў меншай адлегласьці. Сярод першых ліквідуюцца савецкія ракеты на тэрыторыі Беларусі.

На савецкіх экранах упершыню паказваюць амэрыканскага прэзыдэнта жыўцом. Ён увесь час усьміхаецца й жартуе (самы вядомы жарт: калі Рэйгана пасьля замаху на яго паклалі на апэрацыю, ён запытаўся ў хірурга: «Спадзяюся, вы рэспубліканец?»). У прэзыдэнта сымпатычная жонка Нэнсі, зь якой ён ажаніўся другім шлюбам. Больш сымпатычная нават, чымся жонка Гарбачова. Ды ўвогуле, іхні прэзыдэнт быў падобны на каўбоя з пачка цыгарэтаў «Мальбара», якія разам з пэпсы-колай увасаблялі для савецкіх людзей амэрыканскую мару. Абярнулася ж яна праклёнам для homo soveticus — распадам СССР.

У старасьці Рэйгана напаткала трагедыя — хвароба Альцгеймэра. Апошнія гады Рональд Рэйган нікога не пазнаваў, ня мог гаварыць і самастойна рабіць элемэнтарныя рэчы. Ён быў звычайным, хоць і абаяльным чалавекам, сярэднім амэрыканцам, які воляю лёсу спрычыніўся да падзеньня камунізму і шмат у чым прадвызначыў далейшую хаду гісторыі. У тым ліку ў Беларусі.

**Віталь Тарас**

## Проці кантрактызацыі

«Кантракты — зашмарга для працоўных», — пад такім лёзунгам у Магілёве адбыўся мітынг, арганізаваны прафсаюзамі і «Пяцёркай+». Вёў мітынг кіраўнік абласной суполкі Сацыял-дэмакратычнай грамады Юры Новікаў. Выступілі Вінцук Вячорка (БНФ), Сяргей Калякін (ПКБ), Аляксандар Бухвостаў (Партыя працы), Людміла Грязнова (АГП), Аляксей Кароль (БСДГ). Разам з палітыкамі прамаўлялі рабочыя заводу штучнага валакна, будаўнікі. Выступіла Алена Кавалеўская — рабочая малочнага камбінату, якую зьбіў дырэктар. (Пра выпадак пісала «Народная воля».) Пляцоўку ля Дому культуры заводу штучнага валакна запоўнілі тры сотні ўдзельнікаў акцыі.

**Магілёўскі**

## Новая газэта ў Воршы

Выйшаў першы нумар незалежнай газэты «Тэлевеснік». Выданьне падрыхтавалі грамадзкія арганізацыі — МГА «Зьвяз», ТБМ і цэнтар «Крывіч». Новы СМІ-праект паўстаў на аснове мясцовага дадатку да нядаўна закрытай газэты «Віцебская трыбуна». Першы нумар выйшаў накладам у 1000 ас. і раздаецца бясплатна. Далей рэдактары спадзяюцца выпускаць нумар штотыдзень і прадаваць выданьне праз шапікі «Саюздруку».

**Ягор Клішэвіч, www.belngo.info**

## Пытаньні асеменьненьня

Як паведамляе раёнка «Асіповіцкі край», для натуральнага асеменьненьня кароў і цялушак на аддаленых пашах выгашана закупіць у суседнім Кіраўскім раёне два дзясяткі племянных быкоў чорна-пярэстай пароды. Кожны з такіх каштуе 1 мільён рублёў. Прычынай набыцьця сталася складаная сытуацыя ў многіх гаспадарках раёну з кваліфікаванымі, сумленнымі вэтдактарамі і тэхнікамі-асемянатарамі, патрэбнымі для штучнага асеменьненьня, а таксама з адсутнасьцю нармальных дарог з цэнтру раёну да аддаленых пунктаў.

## Людзі без пашпартоў

На пачатку красавіка закончаны перавод усіх працуючых асіпаўчан на налічэньне пэнсій паводле прававрсаніфікаванага ўліку. Але ў ходзе пэрсаніфікацыі раёну яшчэ хапае нечаканасьцей.

Так, у пяці сельгаскаапэратывах працуе 40 рабочых, якія ўвогуле ня маюць пашпартоў. Можна зразумець кіраўнікоў калгасаў, якія праз востры недахоп працоўных рэсурсаў згодны прыняць кожнага, але наяўнасьць афіцыйна няісных работнікаў ставіць гаспадаркі ў двухсэнсоўнае становішча: заробак бяспашпартным выдаецца, а вось пэнсійных налічэньняў на іх рабіць немагчыма.

**Рыгор Латышэвіч, Асіпавічы**

## Нястомны шукальнік экзотыкі

4 чэрвеня ў Полацкай галерэі адкрылася фотавыстава дырэктара выдавецтва «Рыфтур», шэфрэдактара газэты «Туризм и отдых» Сяргея Плыткевіча. Ён аўтар шэрагу фотаальбомаў, сярод якіх самы цікавы — «Беларуская экзотыка». Полацкая выстава называецца гэтаксама. Фотамастак скончыў Полацкі лясны тэхнікум, а затым журфак БДУ. У Беларусі, бадай, няма ніводнай цікавай мясціны, дзе б ні пабываў С.Плыткевіч. Вынікам тых фатасэсій у Полацку стаў фотаальбом «Ад Полацку пачаўся сьвет…», тэкст да якога напісаў Уладзімер Арлоў. Над гэтым альбомам ужо працуюць паліграфісты.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Палітыкі не дазволена

Глуская бібліятэка ўключыла ў сьпіс паслуг разьмяшчэньне рэкламных абʼяў і афішак. Цана прымальная — 200 рублёў за суткі. Але скарыстаць з гэтага дадзена ня кожнаму. Так, старшыню раённага клюбу выбаршчыкаў Ігару Кірыну адмовілі ў разьмяшчэньні ў бібліятэцы абʼявы аб правядзеньні сустрэчы з кіраўнікамі магілёўскіх абласных арганізацый, што ўваходзяць у кааліцыю «Пяцёрка+», — Рыгорам Костусевым (БНФ), Уладзімерам Шанцавым (АГП), Галінай Лісіцынай (Партыя працы).

**Ігар Кірын, Глуск**

## Унікальны круцель

3 чэрвеня суд Берасьця распачаў разгляд справы 42-гадовага, які, працуючы галоўным інжынэрам аднэй правайдэрскай фірмы, за кошт фірмы даваў доступ у Інтэрнэт, унёсшы зьмены ў білінгавую сыстэму кампаніі. Кліентаў хапала: у судзе апытаюць 54 чалавекі, якія плацілі наяўнымі. Махляр зыскаў на афэры амаль 60 млн руб. А выкрылі яго, калі ён сышоў у адпачынак. Яго не было, а ў фірму прыходзілі людзі, што жадалі скарыстацца таннымі паслугамі. Судзьдзя кажа, што гэта першы такі суд па выкарыстаньні высокіх тэхналёгій.

**БелаПАН**




**Тэлефонную будку, што на рагу пр.Скарыны і вул.Казлова ў сталіцы, у той чацьвер акупаваў рой пчолаў. Невядома, чаму выведнікі, якія падшукваюць месца для новай пчалінай грамады, спакусіліся на такое тлумнае месца. Мо прывабіў элітны раён?**

# Ці сьпявае Руслана супраць Лукашэнкі?

## Нататкі з франтоў беларускай інфармацыйнай самаблякады

Скаргі на нязручнасьці, зьвязаныя з «гэтымі граніцамі», — прэрагатыва ня нашай генэрацыі: звычайна пра іх гавораць старэйшае пакаленьне «савецкіх людзей». То ім народы разлучылі, то спаць не даюць — пашпарты давай… Аднак апошнімі гадамі на пагранічны бардак воляй-няволяй даводзіцца зьвяртаць увагу. Як вам, скажам, такі дыялог?

— Кнігі везяце? Што ў кнігах?

— Творы.

— Хто аўтар твораў?

— Франко.

— Супраць «бацькі» піша?

— Дык ён жа памёр!

— Не понял… Как сьмееце!..

Дзяўчына, што вывучае гісторыю ўкраінскай літаратуры, губляецца і не знаходзіць адказу. Тут напярэд выступае яе спадарожнік, інтэлігентна-акулярнага выгляду сьціплы малады чалавек, і ветліва кажа:

— Спадар лейтэнант, гаворка пра ўкраінскага пісьменьніка Івана Франка. Ён памёр каля ста гадоў таму. Гэта клясык, як у нас Якуб Колас. Прабачце…

Але спадар не прабачае.

Спадару лейтэнанту прыкра. Толькі што без чаргі мытню прайшла калёна байкераў з Адэсы. Шыкоўныя «Харлеі», бліскучыя шлемы — усё гэта яшчэ тут, побач. Байкеры зь непрыхаванай цікаўнасьцю сочаць за размовай незнаёмых беларускіх аўтастопшчыкаў зь беларускім жа мытнікам. Ёсьць такія людзі цікавыя — аўтастопшчыкі. Я, напрыклад, да іх не адношуся — люблю камфорт і стабільнасьць. Таму й дзіўлюся са сваёй калегі Ціны Клыкоўскай. Гэта, дарэчы, яна цяпер вяртаецца «стопам» з Кіева.

Усе Ціііны набыткі з кнігарняў суседскае сталіцы ляжаць цяпер пад нагамі. Акуратна. Па адной кніжцы. Проста на асфальце. Прыгожым, бліскучым, мокрым…

Толькі што быў дождж!..

Спадар у форме коса пазірае на адэскіх байкераў. Ён разумее, што ў яго ніколі ня будзе «Харлея».

Цяпер ён разумее яшчэ, што не чытае кніг і гэта ўсе таксама зразумелі. Таму чалавек у форме скупы на словы.

Затое якія гэта словы!

— Так, што ў нас на касэтах?

— Музыка.

— Якая яшчэ музыка?

— Вы «Эўрабачаньне» глядзелі?

— Глядзеў…

— Дык на касэтах Руслана.

— Якая такая Руслана?

— Сьпявачка. З «Эўрабачаньня».

— Пра што сьпявае?

Ну хіба ня песьня — наша мяжа з братняй Украінай?

Я даўно ня езьдзіла ў Кіеў. Памятаю, як у чэрвені 98-га мы зь сябрамі ўбачылі на ўкраінскіх тэлеканалах навіны. Адзін сюжэт быў пра нашу Беларусь. І даведаліся мы пра новы Лукашэнкаў закон: уводзіліся крымінальныя тэрміны за паклёп на прэзыдэнта. Калегі з газэты, у якой я тады працавала, дужа занепакоіліся. Яны абсалютна сурʼёзна прапанавалі мне не вяртацца ў Менск, заставацца жыць у іхнім Кіеве. З таго часу, як пісала тая ж газэта, «маразм на білоруських межах кріпчає». Падставай для такіх слоў на першай паласе сталася няўдалая спроба кіеўлянаў перадаць мне праз цягнік стос нумароў «Украïны молодоï». Праваднічка, як пабачыла прэсу, зьбялела і адмовілася дапамагчы нават за грошы. «У нас дэкрэт прэзыдэнта», — растлумачыла яна. А мае калегі проста правяралі, як той закон Лукашэнкаў, дзейнічае ці не. І апісалі гэты выпадак на першай паласе.

Памятаю, яны на самай справе лічылі, што за кожны матэрыял нас на радзіме могуць пасадзіць. У кожным могуць убачыць «паклёп». Самае цікавае, што запэўнілі ўкраінцаў у гэтым прадстаўнікі… беларускай амбасады. Мне расказалі, што ад дыпляматаў у будынку ля мэтро «Шуляўска» зьявіўся пасланьнік і сказаў:

— Нас не задавальняе праца вашай карэспандэнткі па Беларусі.

— А нас яе праца задавальняе, — сьціснула адказала пасланьніку маё начальства.

Здавалася, час міне — усё неяк утрасецца. Ажно не. І за «паклёп» саджаюць, і носьбітаў любой інфармацыі на мытні баяцца. Украінцам жа вось не прыходзіць у галаву шукаць у дарожных сумках карыкатур на свайго Кучму…

— Пра што сьпявае Руслана? — уражана перапытвалі сябры адно аднаго. — Ну, пра каханьне…

— Каханьне, каханьне!.. Яна супраць прэзыдэнта?

Пільны абаронца радзімы ад паклёпу на «бацьку» гартаў кніжкі і перабіраў фатаздымкі. Усе, хто ехаў праз мяжу ды чакаў надгляду ў чарзе, натоўпам сталі побач і зазіралі цераз плячо лейтэнанту — мабыць, спадзеючыся быць сьведкамі нейкай сэнсацыі.

— Слышь, малая, — пачуўся тут голас над вухам маёй сяброўкі, — мы не лезем в политику. Но если что не то везешь — дай сюда. Заберешь на той стороне вон в том доме… — Гэта былі адэскія байкеры. На іх расчараваньне, улётак ці шрыфтоў для падпольнай друкарні ім не перадалі. Такіх не было.

Замест дзесяці хвілінаў Ціна пратырчала на роднай беларускай мытні амаль тры гадзіны. Чалавек у форме некуды тэлефанаваў, зьвяраючы пашпартныя зьвесткі, пытаючыся, ці не пападаліся гэтыя людзі на парушэньні нашай граніцы.

Ён старанна перабіраў бялізну, падазрона тлумачачы, што цяпер прыдумалі вазіць наркотыкі ў самых брудных насоўках. Найноўшае, значыць, ноў-хаў…

І чалавеку ў форме амаль пашанцавала. На адной брашуры красавалася імя былога ўкраінскага прэм'ера.

— Кто такой Юшченко?

— Юшчанка. Украінскі палітык…

— Палітык! — падскочыў ад радасьці мытнік. — Супраць каго ён?

Давялося шукаць начальніка пагранзаставы. Выслухаўшы Ціну, той заявіў, што мелі месца некаторыя перагібы. Потым пайшоў да падначаленага і нешта шапнуў яму на вуха. Тады небарак-аўтастопшчыкаў нарэшце адпусьцілі.

Памятаю, кожнага разу пасьля падарожжа за мяжу — любую! — было дваістае адчуваньне, што я вярнулася дадому, але хата мая стаіць на тэрыторыі нейкай вялікай зоны. Зоны адчужэньня, як Чарнобыльская. Ці зоны-калёніі, напросту — турмы. Прынамсі, такога ўрачыстага «шмону» з кіданьнем кніжак амаль у лужыны не назірала нават на блякпастах у зоне вайсковых дзеяньняў. Гэта мая хіба. Нашыя памежнікі круцейшыя.

Што б гэта такое друкаванае адвезьці ў Кіеў аўтастопам? Здаецца, недзе ляжыць старая газэта на грузінскай мове…

**Тацяна Сьнітко**

# Сямі мне не дадуць, а год я вытрываю

## Тацяна Процька гатова паўтарыць шлях герояў сваіх кніг




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Вераніка Дзядок

Калі на Тацяну Процьку завялі крымінальную справу за «нявыплату» Хельсынскім камітэтам падаткаў па гранце ТАСІСу, яна са зьдзіўленьнем выявіла, што мэтады і прыёмы ў праваахоўных органаў тыя самыя, што ў савецкія часы, а значыць, яна добра тэарэтычна падрыхтаваная да змаганьня з сыстэмай.

Гады працы над доктарскай дысэртацыяй ў архівах КДБ Тацяна прыгадвае як вельмі важны час у свам жыцьці. Менавіта там яна навучылася не баяцца спэцорганаў. Тады да яе прыставілі капітана, каб яна не падглядала ў недазволеныя месцы ў актах. Тыя старонкі, якія можна было чытаць, пазначылі закладкамі. Праз нейкі час капітана вызвалілі, а ёй дазволілі падглядаць, але не рабіць выпісак з забароненых старонак.

Ксэракопія з Крымінальнага кодэксу зь «яе» артыкулам (243, п.2) ляжыць на стале ў Тацяны. Артыкул прадугледжвае ад трох да сямі гадоў пазбаўленьня волі. Тут жа камэнтуе: «Сямі мне не дадуць, але тры — рука не здрыганецца. Зь іх я прасяджу год, год мне скасуюць за добрыя паводзіны ці патраплю пад амністыю». Дачка Даша ўпэўнена ў тым, што маці сядзе. Яна актыўна пераймае ўсю гаспадарку і супакойвае маці, што будзе дапамагаць бацьку ў бізнэсе і па доме. Кажа, што не даруе, калі зробяць нешта маёмасьці — хаце і фэрме.

### За мяжою нават есьці ня хочацца

На пытаньне, ці ня хоча спн.Процька зьехаць за мяжу, яна цьвёрда адказвае: «Я не паеду. Гэтыя прапановы ідуць з усіх бакоў, нават ад тых людзей, якія робяць правасудзьдзе. У Амэрыцы ў мяне жыве дачка. Я магу зьехаць туды элемэнтарна. Муж дачкі — пасьпяховы юрыст, і пражыць мне там ня будзе праблемы. Але ў Амэрыцы я нават есьці не хачу. Я сьледчага свайго папярэдзіла: я нікуды ня зьеду, нават не разьлічвайце. Будзеце мяне саджаць ці апраўдаеце — я не вінаватая з глездзішча закону. Я буду каштаваць нашай дзяржаве вельмі дорага: праз мяне могуць спыніцца праграмы ТАСІС».

Калегі па БХК таксама падрыхтаваліся да магчымага разьвіцьця падзей і падзялілі абавязкі. «Але за арганізацыю я абсалютна спакойная. Бо мы ведаем, што добры кіраўнік — гэта той, у каго ўсё працуе, нават калі яго самога няма. Калі здарыцца гэтае беззаконьне — гэтым нічога ня скончыцца, а толькі пачнецца. Я заўсёды кажу: няма нічога лепшага, як мёртвыя героі. Я буду сядзець у турме — гэта будзе напамін, стымул для людзей», — кажа Тацяна.

З сыстэмай адбываньня пакараньняў Тацяна знаёмая яшчэ і зь сямейнага вопыту. У яе кабінэце стаіць партрэт стрыечнай бабулі Зінаіды з архіваў КДБ. Бабуля двойчы адбывала тэрмін у лягерах. Яе спрабавалі вэрбаваць інфарматаркай, бо да яе заляцаўся польскі консул. Калі яна адмовілася, яе адправілі ў высылку, дзе зламалася і стала паведамляльніцай.

### Шантаж бабуляй

Бабуля вельмі любіла Тацяну і перад сьмерцю, пасьля чацьвёртай спробы самагубства, прасіла сына паклікаць яе. Тацяна марыць, што ў вольны час зможа напісаць кнігу пра бабулю Зінаіду, «а наагул пра яе трэба здымаць фільм накшталт індыйскага, каб усе плакалі». Бабуліну справу супрацоўнікі органаў паказалі Тацяне і намякнулі, што могуць агучыць гэту справу. Тацяна сказала, што не баіцца: гэта гісторыя пра тое, як чалавеку паламалі лёс.

Сама Тацяна Процька пасьпела пабыць і камсамолкай, і камуністкай. Ва ўнівэрсытэце была сакратаром камітэту камсамолу фізычнага факультэту і гэтым ганарыцца: арганізацыя факультэту лічылася адной з найбуйнейшых у краіне і складалася амаль выключна з хлопцаў. Партыйную кар'еру зрабіць не пажадала, таму што «усё рабіла паводле справядлівасьці». За публікацыю партыйных дакумэнтаў пра льготы нават была пазбаўлена права карыстацца партыйным архівам.

Як сумленная камуністка, Тацяна нават паведаміла партарганізацыі, што зьбіраецца ахрысьціць сваіх дзяцей. На адмысловым пасяджэньні партактыву вырашылі, што ў парадку выключэньня няхай хрысьціць: малодшая дачка нарадзілася ў чарнобыльскі год, маці баялася за яе здароўе. Ахрысьцілі разам дзьвюх дачок і саму маму. Як навяўленыя вернікі, пачалі наведваць царкву, але службы не разумелі, таму праз нейкі час закінулі. Старэйшая дачка Стася пачала хадзіць у касьцёл і прывяла туды быцькоў. Тацяна і дагэтуль узгадвае першую споведзь. «Было вельмі страшна: я перад Богам, здавалася, усе на мяне глядзяць. А муж спачатку адмаўляўся спавядацца, казаў, што грахоў у яго няма. Потым яго пераканаў сябар, сказаўшы: каталіцтва — гэта эўрапейская традыцыя, ты ж будзеш бліжэйшы да Эўропы. Потым мы ў касьцёле і павянчаліся, і цяпер муж больш вернік за мяне».

### «Вера робіць мяне бясстрашнай»

Цяпер амаль штонядзелі Тацяна з мужам і дачкой наведваюць у Смалявічах вагончык, у якім служыцца імша парафіі сьв.Валянціна. Пасьля да іх на абед прыяжджаюць ксёндз з арганістам і манашкамі. Месца за госьця ксяндза — вялікая пашана. Прыход у Смалявічах не такі вялікі, але ён расьце. Яго зарэгістравалі і «выхадзілі» Тацяна зь некалькімі вернікамі. Ганарацца, што іх прыход носіць імя сьвятога Валянціна. «Мая вера дапамагае мне. Я зусім ня маю ніякай мітрэнгі. Ведаю, што ўсё скончыцца добра. Калі выпрабаваньні трэба вытрываць, я іх вытрываю».

Праваабарончую кар'еру Тацяна пачала ў 1995 г., калі амаль нічога ня ведала пра гэтую сфэру. Усё пачалося з таго, што Іван Ціцянкоў на наступны дзень пасьля рэфэрэндуму 1995 г. падраў дзяржаўны бел-чырвона-белы сьцяг на даху Вярхоўнага Савету і напісаў на кавалках сваё прозьвішча. Даведаўшыся пра гэта, Тацяна зьвярнулася ў пракуратуру з просьбай узбудзіць справу. Месяц пракуратура разглядала пытаньне, ці ёсьць склад злачынства. І калі справу зьбіраліся закрыць (бо не было стужкі, дзе запісаны працэс зьнішчэньня сьцяга), знайшліся журналісты, якія захавалі відэастужку зь Ціцянковым на даху, і 150 даляраў (вялікія па тым часе грошы), каб зрабіць копію. На прагляд стужкі сабраліся ўсе пракуроры Рэспубліканскай пракуратуры. Аўдыторыя пракурораў падзялілася, але большая частка была на баку Тацяны. У выніку справа так і не была ўзбуджана: пракурор вынес рашэньне, што Ціцянкоў займаўся ўтылізацыяй зношанага палотнішча дзяржаўнага сьцяга з парушэньнем інструкцыі. Тады Тацяна Процька абурылася беззаконьнем: «Я пракурору так і сказала: Вы запусьцілі мэханізм беспакаранасьці злачынства. І вашу дачку паб'юць, ня будзе адна хадзіць па вуліцы, і ніхто ня будзе застрахаваны ад дзеяньня закону сілы».

А ў ліпені на канфэрэнцыі польскага Хельсынскага фонду ёй і параілі замежныя калегі: для супрацьстаяньня трэба ствараць арганізацыю. Тацяна прыгадвае, што рэгістраваць БХК дапамагалі ўсе, нават машыністкі ў Інстытуце гісторыі і Мінюсьце бясплатна перадрукоўвалі паперы. Тады ніхто ня ведаў, што такое Хельсынскія пагадненьні, і ў Мінюсьце для рэгістрацыі БХК нават запатрабавалі тэкст Дэкларацыі правоў чалавека — тое, што цяпер ведае кожны школьнік.

Сёньня БХК ведае кожны, а да яго старшыні зьвяртаюцца па абарону сваіх правоў жыхары Смалявіч і Забалоцьця, калі ў пасёлку няма вады. Але якраз гэтыя выпадкі — самыя складаныя, Тацяна кажа: «Дапамагаць сваім — горш няма. Толькі перасварышся з усімі».

Аднак у мясцовага насельніцтва Тацяна Процька карыстаецца павагай. Суседкі прыходзяць да яе ў кветнік падзівіцца, што ў яе расьце. Дом, які паказалі на Першым нацыянальным як доказ скрадзеных грошай, будаваўся яшчэ на пачатку 90-х. Узялі крэдыт, і ўся сям'я жыла на 70 рублёў у месяц. Выплацілі: 20 гадоў катаргі, але свой дом варты гэтага. Але хутка здарылася інфляцыя, і ўвесь крэдыт сям'я выплаціла адным разам. Будавалі з улікам дэфіцыту пліт перакрыцьця. Плян дому карэктаваўся ў залежнасьці ад наяўнасьці будматэрыялаў, даводзілася самім прыдумваць канструкцыю драўлянай лесьвіцы, а цяпер мясцовыя майстры робяць такія самыя ў суседніх дамах.

На пытаньне, як яна ўсё пасьпявае, Тацяна Процька сьмяецца: «Гэта адзінае пытаньне, на якое я ня ведаю адказу. Трэба рабіць некалькі спраў адразу, як калі гатуеш абед: і боршч, і мяса, і кампот — каб усе фаеркі на пліце былі занятыя».

# Родныя дзеці Андропава

Аляксандар Фядута

**Працяг. Пачатак у №21.**

Прэзыдэнт памятаў, што калісьці дзяржаўная прэса адну за адной выпускала галяндзкіх качак і пэкінскіх сьцюардэс — апошніх асабіста супраць яго. Яму здавалася, што абавязкова варта ўлічыць гэты перадавы досьвед. І разумны Ўрал Рамдракавіч пайшоў насустрач пажаданьню дзейнага прэзыдэнта. Толькі замест качкі быў выпушчаны «белы бусел».

Менавіта так была названа апэрацыя амэрыканскіх спэцслужбаў, што нібыта мела месца, праваднiцай якой чамусьці была выбрана Тацяна Працька, старшыня Беларускага Хельсынскага камітэту, што ляжала на той момант у больніцы. Гэта было літаральна напярэдадні галасаваньня. У якасьці прылады распаўсюджваньня гэтай інфармацыі была абрана «Советская Белоруссия» — газэта, якая, паводле статутных дакумэнтаў, ня мае права адхіляць афіцыйныя дакумэнты. А дакумэнт быў цалкам афіцыйны — ён прыбыў з Рады Бясьпекі. Менавіта так будзе аргумэнтаваць сваю пазыцыю суд, адхіляючы іск Тацяны Працькі да Паўла Якубовіча, галоўнага рэдактара «Совбелки». І ўсе недзяржаўныя газэты, што гучна абураліся гэтым непарадкам, нават не згадалі, хто на той момант узначальваў апарат Рады Бясьпекі. Мабыць, таму, што вельмі не жадалі згадваць.

Адпрацаваў — і атрымаў узнагароду. Адзін са штатных у тыя часы супрацоўнікаў Адміністрацыі расказваў мне, як ішоў пасьля сваёй адстаўкі Міхаіл Мясьніковіч. Зьлёгку хістаючыся. «Ад стомы?» — спытаў я. «Не, — адказалі мне, — ад нечаканасьці». А кіраўніком Адміністрацыі, насуперак усім прагнозам, быў прызначаны Латыпаў.

Гэта было крайне ўдалае прызначэньне. Ва ўсіх сэнсах удалае. Нават самыя заўзятыя скептыкі сярод прадстаўнікоў Захаду зьлёгку акрыялі духам. Як жа ж — яны памяталі прафэсара з сарамлівай усьмешкай і здольнага мармытаць па-ангельску! Яны ж — дзякуючы нам, журналістам, — лічылі яго дэмакратам. Ну, не дэмакратам, дык амаль лібэралам. Яму забылі, як ён у якасьці памочніка прэзыдэнта па міжнародных пытаньнях выступаў супраць адкрыцьця місіі АБСЭ ў Менску. Правільна, а што яшчэ ён у гэтай якасьці павінен быў рабіць? Затое вось цяпер прыйшла новая, латыпаўская каманда, і ўсё будзе добра!..

Да таго ж ён не мільгаў на тэлеэкране, ня нёс асабістай адказнасьці за зьбіваньне мітынгоўцаў-апазыцыянэраў дубінкамі і ўсяляк дэманстраваў гатоўнасьць беларускіх уладаў усталёўваць нармальныя адносіны з Захадам. Амаль Іван Антановіч, але бяз бурнага камуністычнага мінулага і зь мінулым «кадэбісцкім» (глядзі зьмест «андропаўскага міту»). Так адстаўнога палкоўніка КДБ пачалі ўспрымаць у якасьці апошняга апірышча беларускай дэмакратыі. Далей адступаць не было куды. Далей пачынаецца поўны Шэйман.

Мабыць, Латыпаў сапраўды добра ведаў, якія на самай справе заходнія стандарты. Мабыць, ён папраўдзе добра разумеў, што менавіта трэба казаць заходнім наведвальнікам нашага забытага Богам кута, каб яны паверылі ў шчырае жаданьне беларускіх уладаў наладзіць адносіны з гэтым самым Захадам. Але гэта зусім ня значыць, што ён у сапраўднасьці зьбіраўся ісьці гэтым курсам.

Найперш таму, што новы курс азначаў бы аслабленьне рукі дзяржавы, што сьціскае горла грамадзянскай супольнасьці. А вось да гэтага верны выпускнік андропаўскай школы Ўрал Латыпаў гатовы ня быў. Яму здавалася, што галоўнае — захаваць уладу ў руках прэзыдэнта і захавацца самому ў гэтай уладзе. Чаму самому захавацца? Таму што на зьмену прыйдзе той, хто будзе горшым.

У апошнім ён, несумненна, меў рацыю. Так, на зьмену Сініцыну прыйшоў Мясьніковіч, а на зьмену Мясьніковічу — сам Латыпаў.

Пры гэтым варта ўлічваць яшчэ некалькі акалічнасьцей.

У КДБ вучылі не раскрываць інфармацыю, а хаваць яе. У крайнім выпадку — распаўсюджваць дэзінфармацыю.

Акрамя таго, КДБ, як ні круці, — людзі служылыя, са званьнямі, звыклыя выконваць загад безагаворачна. Таму тое, што пачала выраблять Адміністрацыя пры Латыпаву, не ішло ўжо ні ў якае параўнаньне з аднодна вэгетарыянскімі часамі Мясьніковіча і Замяталіна, які ўраўнаважваў першага. Нават Замяталін, як і пасавала прафэсійнаму палітработніку (які да таго ж меў досьвед палітычнага пройгрышу), разумеў, што ёсьць рэчы, якія рабіць нельга.

Латыпаў слова «нельга», як выявілася, проста ня ведаў.

Таму спачатку былі абезгалоўлены прафсаюзы. Тыя, хто яшчэ зусім нядаўна пляскаў у далоні, вылучаючы Ўладзімера Ганчарыка ў прэзыдэнты, спачатку ўласнымі рукамі справадзілі на пэнсію яго, а затым і бясшкоднага прафсаюзнага артадокса Франца Вітка, які зьмяніў Ганчарыка.

Потым адбылася «кансалідацыя» моладзевага руху. БПСМ, які скампрамэтаваў сябе палітычна неўмеркаванай прапагандысцкай кампаніяй, «схавалі» пад дах экс-камсамолу — Беларускага саюзу моладзі. Так грушудзічку прышчэпліваюць да элітнага дрэва.

Затым настала чарга творчай інтэлігенцыі. Так быў створаны праславуты «холдынг» зь літаратурна-мастацкіх часопісаў. Тыраж іх ад гэтага зьмяніўся ненашмат, але апазыцыйна настроеная частка літаратараў на чале з Васілём Быкавым і Нілам Гілевічам пазбавілася сваёй трыбуны. Крок быў абсалютна бессэнсоўны: як дакладна заўважыў некалі вядомы беларускі аналітык Юры Дракахруст, «інтэлігенцыя і так знаходзілася ў геце, створаным уласнымі рукамі». Але крыку было шмат.

А потым заняліся навучальнымі ўстановамі. Аб'явілі вайну дзецям з Коласаўскага ліцэю — адзінай навучальнай установы краіны, у якой выкладаньне ўсіх дысцыплін ажыцьцяўлялася на беларускай мове. Потым заняліся Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэтам і іншымі прыватнымі навучальнымі ўстановамі. Рабілася гэта ўсё нязграбна, нібыта адмыслова нехта стараўся максымальна агаліць бессэнсоўнасьць і проціпрыроднасьць таго, што адбывалася. Але рабілі гэта ўсё тыя, на ўказах пра назначэньне каго стаяла віза Ўрала Латыпава — разумнага, па-заходняму адукаванага, сучаснага.

І аўтарытэт улады ад гэтага ня рос — падаў!

Але што мог прапанаваць узамен Латыпаў? Латыпаў мог толькі перанесьці навыкі і прыёмы аналізу інфармацыі, атрыманыя ім у КДБ, на ўвесь дзяржаўны арганізм.

Вось толькі хірурга паставілі туды, дзе сапраўды быў патрэбен псыхіятар. Латыпаву здавалася, што кадравыя перамены безь перагляду курсу здольны зьмяніць сытуацыю. У выніку краіна канчаткова прыпадабнілася да кошкі, якой пачалі рэзаць хвост у некалькі прыёмаў. Кошка раўла, але яе ніхто ня чуў. Дакладней, ня слухаў. Працэс вылячэньня быў цікавейшы, чым вывучэньне прычын, зь якіх крычала няшчасная істота.

Так была запатрабавана ідэя «парадку». Запатрабавана — і даведзена да абсурду. Бо поруч з асфальтаваньнем (сям-там) дарог і ўкладваньнем тратуараў яна трансфармавалася ў ідэю ўлады, якая ўсё бачыць і ўсё ведае, ідэю існаваньня адзінага цэнтру прыняцьця рашэньняў. Любых рашэньняў. Адзінага-адзінюткага. Бо няма Бога, апроч прэзыдэнта, і кіраўнік Адміністрацыі — прарок ягоны!

У Мясьніковіча гэта не ўдалося б, нават калі б ён гэтага захацеў вельмі моцна. Для рэалізацыі такой праграмы трэба было атрымаць непадзельны давер кіраўніка беларускай дзяржавы. А Мясьніковічу даверялі, але вельмі абмежавана. Бо ў яго была галоўная загана: яго маглі выбраць прэзыдэнтам.

А Латыпава не маглі. Таму, што не грамадзянін Беларусі паводле нараджэньня. Гэтаксама, паводле Канстытуцыі, не маглі выбраць і Ўладзімера Ярмошына. Але Ярмошын быў самастойнай фігурай, палітыкам і кіраўніком «зь мінулым», а ўсё «мінулае» Латыпава ўкладалася ў пералік указаў і распараджэньняў, падпісаных Аляксандрам Лукашэнкам. Урал Рамдракавіч быў толькі ідэйна ўзгадаваны Андропавым, а фактычна быў вынашаны ва ўлоньні лукашэнкаўскага рэжыму, які адчуваў сябе спадкаемцам рэжыму андропаўскага.

З усімі адсюль вынікамі. І для Беларусі, і для яго самога. Бо калі ведаў Латыпаў, што творыць, дык няўжо верыў у тое, што ў будучыні яму ўдасца дыстанцыявацца ад палітычнай адказнасьці за кадэбізацыю ўсёй краіны?..

Але школа Андропава дала сувэрэннай Беларусі яшчэ аднаго выдатніка. Ім стаў Анатоль Тозік.

Пачаў Анатоль Апанасавіч кар'еру ў БДУ, дзе ён некаторы час кіраваў камсамольскай арганізацыяй. Пайшоў у навуку, абараніў кандыдацкую дысэртацыю. Абараняў, зразумела, па самай прэстыжнай у тыя часы спэцыяльнасьці — па гісторыі КПСС. І выкладаў у самай прэстыжнай ВНУ. У Вышэйшай школе КДБ. Тут ён і атрымаў званьне прафэсара. Праўда, доктарскай дысэртацыі абараніць не пасьпеў: рухнула і гісторыя, і КПСС. Засталася Вышэйшая школа КДБ, перайменаваная з нагоды ў Інстытут нацыянальнай бясьпекі. А што доктарскай Тозік не абараніў, дык мазгі не ступеньню даюцца, а Богам. Ці мала дурняў з доктарскай ступеньню — нават у Акадэміі навук? Анатоль жа Апанасавіч — чалавек разумны. Гэта я магу пацьвердзіць.

Пазнаёміліся мы дзякуючы Віктару Шэйману. Віктар Уладзімеравіч, калі ў 1994 годзе на яго нечакана находзіў добры настрой, рабіўся па-свойму ўважлівым да навакольных і стараўся ўдружыць ім прыемным знаёмствам. У мяне, які працаваў у той час начальнікам упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта, такіх знаёмцаў з падачы Шэймана было два — Латыпаў і Тозік. Але калі Латыпава паклікалі ў Адміністрацыю ў якасьці патэнцыйнага майго пераемніка, дык Тозік ад пачатку прызначаўся мне ў калегі. Яго назначылі начальнікам аналітычнага аддзелу апарату Рады Бясьпекі.

Уражаньне Анатоль Апанасавіч рабіў самае прыстойнае — тым больш на фоне такіх спэцыялістаў Саўбезу, як памятны Сяргей Канцавенка, буйны дзяяч Камітэту дзяржбясьпекі Нагорнага Карабаху часоў пратэктарату Аркадзя Вольскага, які даслужыўся ў сакратарыяце Рады Бясьпекі да тых жа рэгалій, што й Анатоль Апанасавіч (часам у прыступах журбы Канцавенка дзяліўся ўспамінамі пра салодкі час «прафэсійных гутарак» з будучым прэзыдэнтам Арменіі Робэртам Качаранам!). Тозік быў нешматслоўны, уважлівы (як і належыць людзям яго прафэсіі і званьня) і вельмі працаздольны. Ягонай памяці можна было толькі пазайздросьціць, а ўчэпісты розум дазваляў выяўляць нечаканыя сэнсавыя і прычынна-выніковыя сувязі там, дзе асоба недасьведчаная магла ўбачыць толькі чараду выпадковасьцей. Ня ведаю, як ён тады да мяне ставіўся, але я мог толькі зьдзіўляцца з таго, як маўчун Шэйман выкапаў аднекуль такога інтэлектуала. Мы дамовіліся пра каардынацыю дзеяньняў і пра час традыцыйнага чаяваньня. У пятніцу, а 17-й.

**Працяг будзе.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Нешматслоўны, уважлівы і вельмі працаздольны, Анатоль Тозік мае надзвычайную памяць і аналітычныя здольнасьці.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Латыпаву здавалася, што кадравыя перамены безь перагляду курсу здольны зьмяніць сытуацыю. Хірурга паставілі туды, дзе быў патрэбен псыхіятар.

# Фэст ня той, што раней

Нашы ўлады прызвычаіліся кантраляваць усе масавыя мерапрыемствы. Яны лезуць нават туды, дзе іх умяшальніцтва можа аказацца шкодным. У гэтым выпадку гаворка пойдзе пра фэстываль духоўнай музыкі «Магутны Божа», які ўжо 12-ы раз адбыўся ў Магілёве.

За гады існаваньня фэстываль стаўся вядомым далёка за межамі краіны. У фэсьце — у конкурснай праграме і як госьці — удзельнічалі прадстаўнікі дзевяці краінаў. Аднак усё ж шмат хто лічыць, што фэст ужо ня той, што быў раней. Шкодзіць сьвяту, якое пасьпела палюбіцца магілёўцам, той афіцыёз, зь якім яго імкнуцца праводзіць. Фэсту надаюць шаблённую форму. Каб ня гурт «Testimonium» з-пад Катавіцаў (Польшча) і не «Палац», на выступе якога «Зубр» вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг, дык і глядзець не было б на што. Эстэты сярод улюбёных калектываў называлі яшчэ капэлу «Санорус», але ўзровень конкурсных калектываў быў слабенечкі.

Канцэрты праводзіліся на розных пляцоўках, ня толькі ў касьцёле сьв.Станіслава. Так пажадаў гарвыканкам. Раней жа конкурс ладзіўся толькі ў касьцёле, дзе добрая акустыка.

І яшчэ адна акалічнасьць, не згадаць якой я не магу, — гэта тое, што фэст адбываўся ў траўні, калі няма масавых водпускаў. Раней можна было разьмясьціць людзей па студэнцкіх інтэрнатах, цяпер жа такой магчымасьці не было.

На адкрыцьці фэстывалю пасьля выступу старшыні аблвыканкаму, па сумяшчальніцтве старшыні аргкамітэту фэстывалю, які — дзеля таго, што ў залі сядзеў Філарэт, — заявіў, што фэст праходзіць «пад эгідай галоўнай беларускай канфэсіі», выступіў сам уладыка, а толькі потым — ксёндз Раман Факсіньскі. Дарэчы, тое, што фэст праходзіў пад эгідай «галоўнай канфэсіі» — гэта пыл у вочы. Акурат Каталіцкі касьцёл у асобе ксяндза-дэкана й прыклаў больш за ўсіх намаганьняў, каб сьвята адбылося.

І яшчэ з гісторыі фэстывалю: напачатку ён задумваўся як больш моладзевае сьвята. Тагачасны пробашч, а цяперашні біскуп Віцебскі ксёндз Уладзіслаў Блін задумваў зрабіць Магілёў пілігрымкавым цэнтрам і ініцыяваў фэст хрысьціянскай песьні, як яго першапачаткова называлі. І сапраўды, у Магілёў у 1993 і 1995 г. прыходзіла пешая пілігрымка са Смаленску. Дый фэстываль тады меў выразную нацыянальную афарбоўку, БНФ выступаў адным з фундатараў, а ў 1994 г. на фэст прыехаў нават тагачасны яго старшыня Зянон Пазьняк, які, дарэчы, тады ж і павянчаўся ў гэтым жа касьцёле з Галінай Вашчанкай. Партрэт Пазьняка дагэтуль ёсьць на адной з фрэсак касьцёлу. Мабыць, таму яна й завешана белаю прасьцінай.

Цяпер жа ўлады зрабілі з фэстывалю шараговае афіцыйнае сьвята, хаця й міжнароднага маштабу. Балазе, не задушылі…

Ясна, што духоўнымі справамі павінна займацца царква, а ня людзі, якія выхоўваліся на атэістычных ідэалах. Застаецца спадзявацца, што з часам фэстываль духоўнай музыкі вернецца ва ўлоньне Касьцёлу й адродзіцца такім, якім быў раней. А ўлада будзе рабіць тое, што павінна, г.зн. дапамагаць Касьцёлу праводзіць гэты фэст.

**Сяржук Гіркін, Магілёў**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Formuła Biełaruskaści

*I toj, kamu nia stanie śmiełaści navat na abaronu svajoj dušy, — niachaj nie hanarycca svajimi pieradavymi pohladami, nie vystaūlajecca, što jon akademik ci narodny artyst, zasłužany dziajač ci hienerał, — tak niachaj i skaža sabie: ja bydła i bajaźliviec, mnie aby sytna i ciopła.*

*A.Sałžanicyn*


АРЦЁМ ЛЯВА

**Henik Łojka**
**Mastak, pedahoh, kiraūnik pleneru «Lehienda ź piasku»**

«Šlach z Varahaū u Hreki» ūletku 2003 h. nie adbyūsia. Jon loh na dno. I zaniesła jaho załatymi piaskami. Jon čakaje svajich šukalnikaū skarbaū. Siońnia ž moładź nie ūvažaje jaho za skarb. Siońnia moładź, pavodle majich nazirańniaū, na jinšych šlachoch. Dla našaha prajektu ja nia zdoleū znajšci tryccaci junych biełarusaū.

Pad słovam «biełarusy» ja razumieju tych, chto žyvie pa-biełarusku, chto prahnie čuć biełaruskuju movu navokał, a nia tolki samomu razmaūlać. Tolki takija ludzi mohuć uvasobić metu našaha prajektu — stvaryć sabie maleńkuju Biełaruś, krainu Movy pa sutnaści, a pa formie — pryhožy skulpturny plener. Dy dziva, niahledziačy na svaju pryvabnaść, naš prajekt nie znajšoū sabie prychilnikaū.

Nia toje što ū nas vobmal biełarusaū. Nie, nas nie źličyć. Prosta zaniatyja surjoznymi spravami: vybarami, partyjami. Niama kamu hulać, siarod maładych niama nankanfarmistaū. Našy pieršyja ūdzielniki «Lehiendy ź piasku», jakija raskapali Rahniedu, siońnia ūžo studenty Akademiji mastactvaū, — ci nie adzinyja va ūsoj Akademiju, što vałodajuć biełaruskaj movaj. Dyk voś, navat jany nia vartyja stać na «Šlach», bo prystasavalisia da saūka — mohuć pa-biełarusku, a mohuć i pa-rasiejsku, nie «kampleksujuć» z hetaje nahody. Takija «biełarusy» ū piasčanym karjery zrobiać nie maleńkuju Biełaruś, a savočak. Dyk chaj lepš naša historyja zieūraje faktam: na pačatku XXI st. biełarusy nia zdoleli stupić na «Šlach z Varahaū u Hreki».

Niejak była ū nas hutarka z maładym nacyjanalistam. Pa-mojmu, kažu, dastatkova štodzionnaha podźvihu — razmaūlać tolki pa-biełarusku — i Biełaruś uratujecca. Jon ža skazaū (jak i należyć pradstaūniku pragmatyčnaha pakaleńnia), što važniej za ūsio — vydavać jakasny pradukt, a mova… Što mova? Heta prosta srodak znosin. I pryvioū u prykład Skarynu. Maūlaū, jon rabiū Spravu: atrymaū vyšejšuju adukacyju, nadrukavaū Bibliju i h.d. U vyniku takim čynam usłaviū Biełaruś na ūvieś śviet.

«Jon usłaviū nia tak Biełaruś, — zapiarečyū ja, — jak svaju spravu. A jahonaj hienijalnaściaj hatova ūsłavić siabie lubaja krajina». I tut u mianie naradziłasia štości padobnaje da formuły: «Skaryna źjaūlajecca biełarusam, bo *ja* — biełarus, bo *ty* — biełarus, bo jość takaja *nacyja* — biełarusy». Ujaviema na chvilinku, što koła historyi pakaciłasia b inšaj kalajinaj. U jakim-niebudź Pskovie aktyvizavaūsia b jakiści kniaziok, vystajaū by navału Žachlivaha, padmiaū by pad siabie Połacak... I na siońnia my mieli b gruntoūniejšyja tamy vučonych mužoū, što mova Skaryny — heta čyściejšaja pskoūskaja mova.

I budź ty choć trojčy hienijem, davodź usiamu śvietu svajim vysokajakasnym «praduktam», što ty biełarus, naščadki mohuć i nie zaūvažyć tvajho bolu: «Он писал на белорусском языке? Ну что же, гению позволителен любой каприз». Dy što naščadki — sučaśniki ūžo tak kažuć.

Chavali Bykava. Zranku nastroj byū hniatlivy i tryvožny. Ci zdolejem my pachavać svajho Hienija jak należyć? Na Froncie mnie sustreūsia daūni znajomiec, jaki hadoū naccać tamu sprabavaū byū zahavaryć pa-biełarusku. My razam jašče vyrablali znački z «Pahoniaj». A siońnia jon da mianie pa-rasiejsku:

— Слышь, вчера обзваниваю своих друзей, говорю: Василь Быков умер. И ты представляешь, всем по барабану!

Ja jaho pierapyniū:

— Čamu ty da mianie havoryš pa-rasiejsku? Bačyš, u mianie na hrudziach značak z prośbaj «Razmaūlaj sa mnoj pa-biełarusku».

— Ой, только не надо ля-ля… Всё это давно в прошлом.

— Jak heta ū minułym?! — kažu. — Jak ty možaš?! Bykaū ža pamior!.. Hienij pisaū pa-biełarusku, a tabie ūsio pa barabanu!

I takich bieźlič. Ja ūžo nie kažu pra tych, chto на школьной скам'е учыл сціхі Быкава. Nie, ludzi surjoznyja, adukavanyja, jich cełaja nacyja, nazyvajuć siabie našym jimiom — biełarusami. A heta značyć, pretendujuć na našu biełaruščynu, pry hetym va ūpor nia bačać, što jana biełaruskaja. Dla jich lepš pačuvacca prynaležnymi da bykaūskaha «praduktu», jak da źjavy общечеловеческого масштаба. Ведь так даже лучше, по крайней мере, не замыкаемся в узконационалистических рамках.

Što ž, jichni arhument choć možna zrazumieć. Ciažej zrazumieć nas. Čamu my sami pryznajem stvoranaje na rasiejskaj movie zdabytkam našaj kultury? (Praūda, u biełaruskaj litaratury jość redkija vykluceńni nakštałt «Убей президента»). Falšyvaja mova Kupałaūskaha teatru śviedčyć, što tam — rasiejskaja kultura i tolki pa formie— biełaruskamoūnaja. A jak paznać biełaruskaść u zyvapisie? Adzin mastak prapanavaū Leanida Ščamialova ličyć našym mastakom adno za toje, što padpisvaje svaje pałotny praz litary Шч, a nia Щ. Ja liču taki kryter nie ūniversalnym, a značyć, i nie spraviadlivym. Bo jinšamu aktoru dziela takoj ža mety treba «zmarnavać» usio žyćcio paūsiadzionnaj biełaruskaj movaj, bo tolki ū takim vypadku zmožaš na scenie vykazacca ščyra.

Siońnia modna apraūdvać kanfarmizm, maūlaū, abstaviny vymahajuć curacca rodnaj movy, ale tamu my i vyžyli, što hibkija: nas hnuć, a my niazłomki. Naša nacyja — heta viarba nicaja.

Jak pryhoža!..

Viarba hniecca. I heta, biez sumnievu, dobraja jakaść. Ale jaje ž nia hnuć, a siakuć užo siakieraj. I da kamla pryščapili čužy parastak, jaki jašče pa inercyji nazyvaje siabie белорусским, ale zaraz i hetaje słova adsochnie. Filazofija «viarby» nas nie ūratuje. Svaječasova heta ściamiū Pilipka-synok i skazaū załatyja słovy: «Nia ū javar, a ū kamień». Nam treba kamiennym muram abaraniać svajo.

Nie sakret, rusifikacyja idzie zhary, ad dziaržavy. Beścić jaje, rodnuju, — śviataja sprava. Ale takich ža adnosinaū vartaja i hleba, bo ź jaje siłkujecca dziaržaūnaja rusifikacyja. Hleba — tut, popleč z nami, u vokryku pradavački: «Гаварыце па-рускі. Я не панімаю». A jašče važčej — u vystupie mastaka-pahonieūca na biełaruskim telekanale pa-rasiejsku, «bo skazali, što ū ich farmat taki».

Formuła biełaruskaści music być takoju: BIEŁARUS JOŚĆ TOJ, CHTO MYŚLIĆ I RAZMAŪLAJE PA-BIEŁARUSKU.

Mo ja kaho pakryūdziū takoj formułaj? Ščyra spadziajusia dastać u mordu. Horš budzie, kali ja spaźniūsia. I na dvary ūžo časy, padobnyja da savieckich, kali fraza «Ty biazbožnik!» nie ūsprymałasia za abrazu. Naadvarot, adkazam mahło być: «Да, я атеист и этим горжусь».

Nam treba pavažać śviadomy vybar našych sučaśnikaū — prosta nie pryznavać jich biełarusami. Da čaho pryviadzie takaja prostaliniejnaść? Uśviedamlaju — da bolu. Bo reža pa žyvym nacyju, navat siamju. Navat vaš pakorny słuha nia ūvieś adpaviadaje svajoj ža formule. Zirniecie na hety tekst — skroź rasiejskamoūnyja ūstaūki. Kajusia. Dy što ja. Hieroji nacyji — licejisty (niekatoryja) — u pobycie biez prymusu karystajucca rasiejščynaj!

Ale my musim pajšci na achviary, kab dać jasny aryjencir maładym. Hodzie błukać u vierbałozie, vychodźma na jasny i ćviordy šlach! Biełaruskaść našaj nacyji zaležyć ad naščadkaū. Kali jany siabie buduć uśviedamlać biełarusami, dyk aūtamatyčna ūsio navokał stanie biełaruskim. Tady nia tolki Ščamialoū — Mark Šahał stanie biełaruskim mastakom. I tady budzie zusim nie istotna, što myśliū i razmaūlaū jon pa-francusku dy staleū u «российском губернском городе Витебске». Usio našaje budzie biełaruskim!

# Паўстань, (ня толькі масавая) культура!


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Цяжка пераацаніць, наколькі важна, каб разьвівалася беларуская папса, каб шырылася й квітнела айчынная маскультура. Жыцьцёва неабходна, каб абкураныя падлеткі жлукцілі ў пераходзе не якую-небудзь «Балтыку», а хаця б «Крыніцу», абмяркоўваючы пры гэтым не паганых «Тату» або БГ, але конча «Крамбамбулю» ці «Ляпісаў». Рацыя, кожная нармальная незалежная краіна мусіць мець сваіх уласных поп-зорак, апэратараў мабільнае сувязі, спорткуміраў і г.д. Але ці ня больш істотна, у якім стане справы з сур'ёзнай літаратураю, з кіно, з клясычнай музыкай? Уяўляю, зь якой агідай ці, як мінімум, нудотай скрывіліся пасьля гэтых словаў многія чытачы. Аднак я асабіста ніколі не паверу, што прараўсьці некалькі просьценькіх куплетаў у мікрафон перад ашалелым натоўпам у якім-небудзь Лядовым палацы складаней, чым выканаць, напрыклад, фартэпіянную санату сі-мінор Ліста ці віялянчэльную санату Рахманінава ў камэрнай залі на 150—200 чалавек. Колькі б нас ні пераконвалі, што праца на эстрадзе гэткая ж складаная і патрабуе гэткага ж прафэсіяналізму, як і творчасьць у акадэмічным жанры, — ня ўдасца ніколі.

Але не пра гэта размова. У часе паўстаньня мас анікога не турбуе вартасьць, элітарнасьць ці сур'ёзнасьць прадукту. Сёньняшнім крытэрам у ацэнцы твораў «мастацтва» ёсьць хіба «падабаецца — не падабаецца». Як, дарэчы, і ў ацэнцы палітыкаў, па вялікім рахунку. Хай сабе, на маю ўласную думку, параўнаць сымфонію Зьмітра Смольскага зь песенькай Аляксандры й Канстанціна — тое самае, што суаднесьці матч фінальнай групы Чэмпіянату Эўропы па футболе з гульнёй дваровых хлопцаў на пыльнай пляцоўцы ў адну браму. Істотна тут, ці купіць гэтую песеньку як мага большая колькасьць людзей. Істотна нават не для гэтай песенькі ці сымфоніі, а для самога выканаўцы, каб ён мог прыстойна існаваць, каб ягоная праца годна аплачвалася. Дзіўна: у спорце чамусь плацяць больш Зыдану й Шаўчэнку, чым Валадзянкову ці Макоўскаму. Аднак у музыцы, падобна, адбываецца акурат наадварот.

Так ёсьць ня толькі ў Беларусі ці Расеі, а па ўсім чыста сьвеце. Паўсюль дыскарні заваленыя рок-, поп-, панк-, рэп-… якой хочаш музыкай, і толькі ў якім куце (большым ці меншым, у залежнасьці ад краіны) сабрана прадукцыя з акадэмічнымі творамі. У нашай краіне такая прадукцыя практычна адсутнічае ў крамах наагул (танныя варыянты кшталту «The Best of Mozart» не разглядаюцца). Паўсюль «немузыканты» і атрымліваюць на парадак больш, і вядомыя куды больш за «музыкантаў». Аднак калі ў Беларусі квіток на канцэрт поп-гурту каштуе 25 тысячаў, а на канцэрт піяніста — тысяч пяць, дык і на «ганарар» гэты піяніст можа купіць хіба дзьве-тры пляшкі піва для сяброў. Або гарэлкі — хутчэй, мабыць, гарэлкі. Да таго ж «майстры» поп-музыкі зь лёгкасьцю могуць зарабляць на вясельлях і банкетах, тады як мастацтва сапраўдных музыкаў патрэбнае пакуль што хіба ім самім і невялікай купцы аматараў.

Мне здаецца, што Беларусь ачуняе й наблізіцца да адчуваньня сябе як эўрапейскай краіны яшчэ й тады, калі тут зьявяцца прыватныя прадусары, студыі гуказапісу, канцэртныя залі, клясычныя радыёстанцыі і ўсё такое, хаця б як у Літве ці Польшчы. Я маўчу пакуль што пра Ангельшчыну ці Нямеччыну. Тады для людзей прозьвішчы Чайкоўскага і Шапэна будуць абазначаць ня нешта абстрактна «культурніцкае», а стануць часткай іхнага паўсядзённага быцьця. Тады мо з часам і імёны Андрэя Паначэўнага ці Зьмітра Цыпкіна будуць прадметамі рэальнае гордасьці. Трэба ж бо любіць сваё, купляць беларускае.

**Віталь Стахіевіч**

# Чарнаскуры комік ганьбіць нэграў

**Пасьля апошняга выступленьня аднаго з самых вядомых амэрыканскіх гумарыстаў нікому не да сьмеху. Біл Косьбі шакаваў усіх сваімі поглядамі на чарнаскурых амэрыканцаў.**

У час, калі «Нью-Ёрк Таймз», Сі-Эн-Эн і кангрэсмэны абмяркоўваюць Ірак і кампанію па выбарах прэзыдэнта, у школах, касьцёлах, радыёперадачах, куды тэлефануюць слухачы, на сходах грамадзкіх арганізацый і ў суполках чарнаскурых дзеячоў некалькі дзён гаворка толькі пра адно — пра выступленьне Біла Косьбі.

Комік, які дзякуючы вядомай на ўвесь сьвет праграме «Шоў Біла Косьбі» зарабіў у 80-х і 90-х гадах мільёны даляраў, выступаў два тыдні таму на вялікім прыёме ў Вашынгтоне з нагоды 50-гадовага юбілею пастановы Вярхоўнага Суду, якая забараніла расавую сэгрэгацыю ў амэрыканскіх школах. У прысутнасьці дзясяткаў афраамэрыканскіх дзеячоў з усёй Амэрыкі Косьбі, які зрабіўся ў свой час адной зь першых чарнаскурых тэлезорак, атрымліваў узнагароду за сваю дабрачынную дзейнасьць. І ў гэты момант, з характэрным для яго красамоўствам, вострым як брытва языком ён атакаваў чорных жыхароў бедных раёнаў. Ён абвінаваціў іх у безыніцыятыўнасьці й безадказнасьці, у дрэнным выхаваньні дзяцей, у бязладным палавым жыцьці падлеткаў, пазашлюбных дзецях, непавазе да закону і сацыяльнай пасіўнасьці — у адрозьненьне ад тае актыўнасьці, якая характарызавала пакаленьні, што ў свой час змагаліся за правы чарнаскурага насельніцтва (фрагмэнты выступленьня вы можаце прачытаць ніжэй).

Лідэры афраамэрыканцаў слухалі прамову ў шоку, з каменнымі тварамі. Потым на сцэну выйшаў арганізатар прыёму, прэзыдэнт Нацыянальнай асацыяцыі за прагрэс каляровага насельніцтва (НАПКН) — найбуйнейшай арганізацыі, якая змагаецца за правы чарнаскурых амэрыканцаў. Усе з напружаньнем чакалі, што будзе. Але Кейсі Мф'юм шчыра абняў Косьбі. Потым ён прызнаўся, што, хоць гэта былі прыкрыя словы, ён згодзен з большасьцю зь іх.

## Нічога ня буду абвяргаць

Прайшло некалькі дзён, пакуль выступленьне Косьбі трапіла ў цэнтральныя амэрыканскія СМІ. Апошнія нібыта вагаліся: ці не парушае яно залішне рамкі палітычнай карэктнасьці. Нібыта чакалі, ці не абвергне Косьбі свае словы, сказаўшы, што яго ня так зразумелі.

Але праз некалькі дзён Косьбі зрабіў заяву, у якой паведаміў, што ня будзе нічога абвяргаць.

Некалькі публіцыстаў потым нават прызналіся, што сапраўды ня ведалі, ці выпадае камэнтаваць гэтыя выказваньні. А неўзабаве распачаліся гарачыя дэбаты, у якіх узялі ўдзел амаль усе буйныя чарнаскурыя журналісты.

Многія зь іх падтрымалі коміка, хоць і з рознымі агаворкамі. І падзякавалі яму за распачынаньне сапраўды шчырай дыскусіі, неабцяжаранай няправільна зразуметай палітычнай карэктнасьцю.

Шмат хто, аднак, накінуўся на Косьбі, які дагэтуль быў у афраамэрыканскім асяродзьдзі ўзорам чалавека, што, нягледзячы на жыцьцёвы посьпех і зароблены мільёны даляраў, ніколі не адракаўся сваіх каранёў.

«Косьбі абраў сваёй цэльлю людзей, якія яго любяць і ім захапляюцца. Хутчэй за ўсё, ён проста забыў, што значыць быць маладым, чорным і бедным у сёньняшняй Амэрыцы», — напісаў Джымі Ізраэль у часопісе «Амэрыкен Спэктэйтар».

## Косьбі як белы

«Біл Косьбі зрабіў для чорных больш чым дастаткова, каб забясьпечыць сабе права казаць тое, што ён думае, — лічыць Юджын Кейн, чарнаскуры аглядальнік «Мілуокі Джорнал Сэнтынэл», які выхоўваўся ў тым самым бедным раёне Філадэльфіі, што й Косьбі. — Аднак дзіўна выглядае, калі Косьбі ўжывае тыя самыя аргумэнты, што й белыя, якія хочуць абгрунтаваць свой расізм».

«Косьбі — гэта ня бедная чорная маці-адзіночка, якая спрабуе выхаваць дзяцей у гецэ, ён ня ведае, як цяжка гэта зрабіць у Амэрыцы ў 2004 г. А калі ўжо вялікая тэлезорка хоча з маральнага пункту гледжаньня павучаць маці-адзіночку, то на здароўе, спадару Косьбі, але як там з вашым пазашлюбным дзіцем?» — напісаў у камэнтары Кейн. Отам Джэксан, меркаванай пазашлюбнай дачцэ Біла Косьбі, сёньня 30 год. У 1997 г. яна абвясьціла, што Косьбі — ейны бацька. Косьбі прызнаўся ў рамане зь яе маці, але не прызнаў яе дачкой.

Косьбі патэлефанаваў Кейну, як і некальким іншым чарнаскурым журналістам, якія яго раскрытыкавалі. Пасьля гадзіннай размовы Юджын Кейн сказаў, што Косьбі ня меў на мэце абражаць усіх чорных зь бедных раёнаў.

Рашуча адхіліў атаку коміка кіраўнік юрыдычнага аддзелу НАПКН Тэадор Шо, які заявіў у «Вашынгтон Пост»: «Большасьць бедных афраамэрыканцаў робіць усё, што ў іх сілах, каб добра выхаваць сваіх дзяцей. Бацькі, у тым ліку маці-адзіночкі, працуюць за мінімальныя заробкі, часам на дзьвюх работах, каб зарабіць на ўтрыманьне сям'і. Наша дзяржава вядзе барацьбу зь беднымі, а ня зь беднасьцю. Гвалт і хаос у чорных раёнах — праблемы відавочныя, але шмат праблем, пра якія гаворыць Косьбі, вынікаюць з галечы, асяродкам якіх зрабіліся гэтыя раёны. А гэта выклікана адсутнасьцю цікавасьці да іх з боку ўраду і бізнэс-колаў».

Шо, адзін з найбуйнейшых нэгрыцянскіх дзеячоў ЗША, заканчвае, аднак, лагодна, пішучы, што «кожны, каго шчыра хвалююць інтарэсы афраамэрыканцаў», павінен згадзіцца, што, па-першае, многія выказваньні Косьбі, напрыклад адносна недахопу адказнасьці з боку бацькоў і бяздумнага гвалту, маюць пад сабой падставы; па-другое, чарнаскурая меншасьць мусіць па-ранейшаму змагацца з сыстэмным расізмам, як і дзесяцігодзьдзі таму.

На гэтым абмеркаваньне прамовы Біла Косьбі прыпынілася. Мабыць, да наступнага разу, калі нехта папросіць коміка сказаць пару ласкавых слоў…



WWW.NAB.ORG

## Што сказаў Косьбі

Людзі некалі ладзілі дэманстрацыі, падстаўляліся пад каменьне, каб здабыць роўны доступ да адукацыі. А сёньня ёлупы толькі швэндаюцца бяз мэты. Людзі зь бедных сямей не дарастаюць да адказнасьці. Не выхоўваюць сваіх дзяцей! Ім купляюць бутсы па 500 даляраў за пару. А на школьныя падручнікі шкадуюць дзьвюх соцень даляраў.

[Афраамэрыканцы] толькі таўкуцца на плошчах і нават ня ведаюць ангельскай. Я нават не валодаю мовай, якую яны ўжываюць. Я вінавачу ў гэтым маладых, пакуль не пачуў, як выказваюцца іх маткі. А потым пачуў бацькаў. Усе ведаюць, што добра валодаць ангельскай вельмі важна, толькі ня гэтыя ёлупні. Але ж ніхто ня стане доктарам, калі ён умее гаварыць толькі на жаргоне. Гэтых людзей нішто не апраўдвае. Бо яны спрадвеку жывуць у Амэрыцы, а іхняя ангельская горшая за ангельскую карэйцаў, якія сюды нядаўна прыехалі.

Так, прысуд у справе «Браўн супраць Міністэрства адукацыі» (пастанова, якая ліквідавала расавую сэгрэгацыю ў школах. — **Рэд.**) адкрыў нам дарогу. Толькі што мы зрабілі потым? Белыя з падзей тых часоў сьмяюцца! А як ім не сьмяяцца, калі пад 50% чорных кідаюць школу, а рэшта сядзіць у турмах.

[Бацькі] плачуць, калі на іхняга сына надзяваюць аранжавы турэмны камбінэзон. А дзе вы былі, калі яму было два гады? Дзе былі, калі яму было 12 год? Дзе былі, калі споўнілася васямнаццаць? Няўжо вы ня ведалі, што ў яго пісталет? Ну, і дзе ягоны бацька?

Касьцёл адчынены толькі ў нядзелі, вы ня можаце ўвесь час прасіць Ісуса, каб ён усё для вас рабіў. Ня можаце няспынна паўтараць, што Госпад Бог напэўна вам дапаможа. Вы ўжо ў Бога ў пячонках седзіце з сваімі просьбамі!

[Маладыя людзі] адзяваюць апранахі навыварат. Хіба гэта не прымета таго, што зь імі нешта ня так? Шапкі насоўваюць задам наперад. Штаны ў іх валакуцца па зямлі. Пра што гэта сьведчыць? Чакаюць, што Ісус падцягне ім порткі? А дзяўчына, што нацягвае такую кароткую сукенку, што з-пад яе відаць пramежнасьць, а на целе нейкія іголкі й колцы? Зь якой часткі Афрыкі гэта паходзіць? Дый гэтыя ж людзі зусім не афрыканцы, яны ня маюць ніякага ўяўленьня пра Афрыку!

А гляньце на іхныя імёны: Шэніква, Тэліква, Махамэд, абы-што нейкае. Усё адно ўсе трапляюць у каталажку.

Баскетбалісты — мультымільянэры — ня ўмеюць напісаць нават некалькі сказаў. Футбалісты — мультымільянэры — ня ўмеюць чытаць. Так, мультымільянэры!

Мы ня можам увесь час толькі вінаваціць белых. Белыя ж усё-такі з намі не жывуць. Свае крамы ў нашых раёнах яны зачыняюць рана. Толькі карэйцы, якія нас яшчэ дрэнна ведаюць, трымаюць крамы, адчыненыя 24 гадзіны ў суткі.

Некалі людзі мелі хоць трохі сораму. А сёньня? Адна кабета, а ў яе васьмёра дзяцей, дзесяць мужоў, хахаляў, ці як іх там сёньня называюць… (…) Бо вы ж ужо і ня ведаеце, з кім гэтым займаецеся. Гэта можа быць ваша бабуля! Кажу вам, бо яна пры гэтым можа быць досыць маладая. А чаму не, калі заводзіш дзіця ў 12 год. Тваё дзіця вырастае да 13 год і таксама заводзіць дзіця. І колькі вам год? А вы ўжо бабуля. У выніку ва ўзросьце 12 год можна займацца сэксам са сваёй бабуляй! Да чаго яшчэ дойдзе прагрэс?

А што сказаць пра дзяўчат, якія цкуюць сваіх сябровак, што хочуць застацца цнатлівымі? Адкуль гэтыя чортавы нэгрытосы бяруцца? Чаму іх ніхто не выхоўваў, не сачыў за імі, каб трымалі свае губкі на замку?

Спадарыні і спадары, гэта хвароба!

А гэтыя, што сядзяць у турмах? Гэта ніякія не палітычныя вязьні. Гэта людзі, якія скралі бляшанку кока-колы. Атрымалі кулю ў лоб за кавалак піронжага. А мы абураемся, крычым, што паліцыя не павінна ў іх страляць. Толькі на халеру яны цягнуць руку па гэтае піронжае?

**Паводле «Gazety Wyborczej»**

# Асалода і яшчэ раз асалода

назіраньні з Канаў–2004

Працяг са старонкі 2.

**«НН»: Перамога карціны Мура — гэта што: даніна павагі да неігравога кіно, новы зварот да дакумэнталістыкі ці палітычная акцыя?**

**Ігар Сукманаў:** Я пачну ўсё-такі з таго, на што скіроўваў і журналістаў, і публіку сёлетні Канскі фэстываль. Крэда было не адкрываць новых імёнаў, не займацца прасоўваньнем артхаўсных праектаў, а паказваць кіно, якое проста прыносіць задавальненьне. Ня важна, тычыцца гэта высакалобай аўдыторыі альбо гледачоў прасьцейшых. Галоўнае — кіно як крыніца розуму й асалоды.

Таму ўсе конкурсныя карціны так ці інакш адпавядалі гэтаму пастуляту. Квэнцін Таранціна, старшыня журы, калі яго распытвалі, які крытэр ацэнак, адказваў, што галоўнае «не палітыка, я апалітычны чалавек», а каб кіно было цікавае яму як гледачу.

Калі фільм Мура ўзнагародзілі, то расейская прэса не магла схаваць свайго расчараваньня, бо ад палітыкі ў Расеі стаміліся. Для публікі заходняй гэтая карціна — «масток, які аб’ядноўвае традыцыі Старога й Новага Сьвету: французскае вальнадумства і амэрыканскі патас». Але пагаджаешся з тым, што гэтая карціна сымбалічна мае права быць узнагароджанай, таму што яна адлюстроўвае працэсы ня толькі ў кіно, але і ў сьветасузіраньні, і ў сьвядомасьці, якія пануюць у заходнім грамадзтве.

**«НН»: А чаму такі скандал? Чым карціна зачапіла гледача?**

**І.С.:** Карціна Мура антыбушаўская, яе нельга назваць антыамэрыканскай. Яна імкнецца расплюшчыць вочы амэрыканскаму дэпалітызаванаму гледачу. Тое, з чым мы жывём, — мы ў гэтым адукаваныя, амэрыканец на гэта не зьвяртаў увагі. А цяпер на гэта ўвага заакцэнтаваная. І ў выніку такое разуменьне, таму што сытуацыя праблематычная — і ня толькі для амэрыканскага грамадзтва, але й для сьвету як такога. Вось гэта й выводзіць карціну за межы проста правакацый, скіраваных супраць адной асобы — Джорджа Бушамалодшага. Так, аўтар выкарыстоўвае форму памфлету, нельга назваць гэтую карціну нейкай выбітнай па кінамове — яна распавядае ўсё вельмі даходліва, вельмі проста, але чаго нельга адабраць у Майкла Мура — ён выдатны апавядальнік. Ён лёгка можа пераходзіць з адной сфэры ў другую, ад Буша да простых амэрыканцаў. І робіць гэта з жывой зацікаўленасьцю, калі можна і пасьмяяцца, а можна і паспачуваць, і паплакаць. Гэта ўсё гуляе на карціну.

**«НН»: А дарэчы, аналягі зь беларускімі карцінамі ёсьць?**

**І.С.:** Я ня стаў бы гэтага рабіць. Аналягі «Фарэнгейту» можна знайсьці ня толькі ў беларускім, а і ў грузінскім, у кітайскім кіно. Гэта дакумэнтальнае кіно, якое імкнецца агаліць мэханізмы ўлады. А гэтым займаюцца публіцысты ўсіх часоў і народаў. Таму я кажу — тут няма анічога наватарскага, што занадта выбівалася б. Але гэта карціна вельмі ўдала трапіла ў пэўны час і спрабуе абудзіць грамадзянскую сьвядомасьць.

З другога боку, калі браць чыстае кіно, палітыку кінэматаграфічную, то дамінантная роля амэрыканскага кіно відавочная. І Каны прызнаюць за амэрыканскім кіно права лідэра. Але яны прызнаюць гэтае права толькі ў тым выпадку, калі амэрыканскі кінэматограф чэрпае рэсурсы і натхненьне непасрэдна ў кінэматаграфіі Старога Сьвету.

**«НН»: А што яшчэ на Канскім фэстывалі было цікавага? Якія там былі інтрыгі?**

**І.С.:** Паколькі быў абраны дэвіз «Асалода і яшчэ раз асалода», а карціны ўсе розныя, то вельмі складана было сказаць, якое кіно выйдзе ў лідэры. Тут непрадказальнасьць. Сачылі за рэакцыяй Таранціна. Відавочна было, што Кустурыца наўрад ці атрымае ўзнагароду, — занадта анархічнае кіно, яно не стыкуецца з амэрыканскім кінамастацтвам.

Яшчэ цікавая тэндэнцыя: усе старыя майстры, якія былі прэзэнтаваныя на фэстывалі, — а гэта Кустурыца, Вонг Кар-вай, Пэдра Альмадовар, Таранціна (два апошнія — па-за конкурсам), браты Коэны — дэманструюць найвышэйшы пілятаж кінэматаграфічных стылістаў, але стылістаў стомленых. Іхнія карціны ўжо ня так дзейнічаюць. Няма той лёгкасьці, якая была. На іх тле вельмі прывабна выглядалі карціны рэжысэраў, імёны якіх яшчэ нічога не гавораць. Напрыклад, нямецкі рэжысэр Ханс Вайнгартнэр зь фільмам «Сытыя часы прайшлі», Тоні Гатліф за фільм «Выгнаньнікі» атрымаў прыз за рэжысуру. Вельмі цікавае італьянскае кіно «Наступствы каханьня». Тайляндзская карціна «Трапічная хвароба» (прыз журы) — абсалютна першабытнае кіно. І эўрапейцу немагчыма зразумець — гэта ад выкшталцонага ўмельства альбо ад наіўнасьці.

**«НН»: А што гэта за гісторыя з паўднёвакарэйскім фільмам «Стары хлопчык»?**

**І.С.:** Галоўная інтрыга разгортвалася паміж фільмам «11 верасьня па Фарэнгейту» і «Старым хлопчыкам». «Стары хлопчык» («Old boy») атрымаў другую прэмію, «Гран-пры». Гэты фільм, як лічыцца, адлюстроўвае асабістыя густы Таранціна. Усім вядома прыхільнасьць Таранціна да азіяцкага кіно, прычым да дастаткова жорсткага кіно, да кінэматографу, поўнага гвалту, дзе шмат увагі надаецца крыважэрнаму й жорсткаму…

**«НН»: Гэты фільм пэўна будзе забаронены ў Беларусі…**

**І.С.:** Можа, так, а можа, і не. Ва ўсякім разе, карціна «Стары хлопчык» дэманструе сьвежасьць мовы і, галоўнае, інтрыгі. Тое, што прапануе эўрапейскае кіно, — яно выглядае ўжо стомленым, і любая «замарочка», любы сюжэтны фінт Альмадовара — яны ўжо так не ўзрушаюць сьвядомасьці. Тое, што прапануе паўднёвакарэец, з улікам азіяцкага мэнталітэту, здольнае скалануць. «Стары хлопчык» — вельмі разумнае, вельмі відовішчнае, вельмі жорсткае кіно, якое разважае на тэму помсты. Помста належыць нам. Помста, якая ў сёньняшнім грамадзтве табуяваная, — і, як мяркуе рэжысэр, каб пазьбегнуць, выціснуць у сучаснага чалавека гэтае пачуцьцё, спатрэбілася кіно, каб у форме прыпавесьці выгнаць дэманаў.

**«НН»: А ці не амэрыканізаваліся эўрапейскія Каны?**

**І.С.:** Не. Калі параўнаць колькасьць амэрыканскіх фільмаў у мінулыя часы й сёньня, то нічога не зьмянілася. Проста ёсьць аб’ектыўныя рэчы. Як бы мы любілі ці не любілі Галівуд — з пункту гледжаньня рамяства, дакладнасьці арганізацыі, абсалютнага трапляньня ў мазгавую зьвіліну гледача, калі ён усё лёгка засвойвае, адмовіць амэрыканскаму кіно нельга. Яно меней рэфлексоўнае, але не губляе аўтарскага пачатку. Яно ўдала камбінуе забаву і разумнае начыньне. І нават Ларс фон Трыер, апалягет Антыгалівуду, — для яго Галівуд — гэта зорка, зь якой ён змагаецца, гэта ягоны маяк. Такі расклад сілаў, што Амэрыка перамагае. Але ў Канах перамагае Амэрыка, якая арыентуецца не на амэрыканскага гледача, а на заходнеэўрапейскага.

**«НН»: Вернемся да дакумэнтальнага кіно. Карціна Віктара Асьлюка «Мы жывём на краі» прынятая й узнагароджаная на шматлікіх фэстывалях. Ігравы фільм Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя» таксама выклікаў вялікую зацікаўленасьць. А вось гэтыя карціны маглі б увайсьці ў Каны?**

**І.С.:** Складана на гэтае пытаньне адказваць. Што да фільмаў «Мы жывём на краі», «Акупацыя» — ёсьць, разумееце, свае законы. Усётакі Каны — гэта *багаты* фэстываль. Карціны, якія туды трапляюць, яны фінансава зробленыя напоўніцу. Гэта ня беднае кіно, гэта не кіно незалежнае. Гэта карціны, якія маюць апекуноў — у асобе буйных кампаній, пракатчыкаў. І ёсьць свой почырк у адборы карцін, свая каньюнктура, свае прыхільнасьці — ёсьць ніша, якую займаюць менавіта канскія карціны.

Почасту, перш чым трапіць у конкурсную праграму, фільмы праходзяць «стадыю праверкі»: ёсьць праграма «Адмысловы погляд» — інфармацыйная праграма — альбо паралельныя конкурсы, якія ня маюць дачыненьня да Канскага фэстывалю, як «Тыдзень рэжысэраў», «Тыдзень крытыкаў». Але на гэтых праграмах прыглядаюцца да новых імёнаў, новых рэжысэраў. Толькі пасьля гэтага новыя імёны трапляюць у конкурсную праграму.

Карціна Асьлюка ня ўпісваецца ў Канскі фэстываль — проста фарматам; гэта крыху іншае кіно. Фільм Андрэя Кудзіненкі — паглядзім, калі яго на плёнку перавядуць, як ён будзе ўспрымацца, — але ўсё роўна гэта нізкабюджэтнае кіно, хаця й вельмі высакаякаснае ды годнае… Але трапіць адразу ў канскую абойму…

**«НН»: Пэўныя этапы павінны быць…**

**І.С.:** Справа яшчэ ў тым, што Стары Сьвет, Каны адлюстроўваюць настроі *заходнеэўрапейскага* гледача, заходнеэўрапейскага інтэлектуала. І што хвалюе такога гледача, тое і трапляе ў Канскую праграму.

**«НН»: Так што тут і несупадзеньне мэнталітэтаў…**

**І.С.:** Вядома, у нейкай ступені. Вазьміце таго ж Паўла Лунгіна — у Расеі да яго стаўленьне дваістае, а французы яго прымаюць. Проста ён адразу працуе на заходняга гледача. Дзе які акцэнт — ад гэтага залежыць, адчыняць табе браму Канскага фэстывалю ці не.

**«НН»: У нас ёсьць людзі, якія здымаюць годныя карціны, — і Асьлюк, і Кудзіненка. А мы можам сказаць, што калі беларускія фільмы будуць пэўным чынам фінансаваныя, то ёсьць надзея трапіць на Канскі фэст?**

**І.С.:** Я спадзяюся. І «Акупацыя», і фільмы Асьлюка — яны сапраўды адкрытыя сьвету…

**«НН»: …а астатні «беларускі мэйнстрым» скіраваны і замкнёны на Расею?**

**І.С.:** Ён скіраваны на ізаляцыю. А карціны Кудзіненкі і Асьлюка не захрасьлі ў савецкай прасторы. Яны спрабуюць глядзець шырэй. Нездарма карціну Андрэя ўзялі на Ратэрдэмскі фэстываль і на конкурс маладых дэбютаў на Маскоўскі кінафэстываль у клясу «А»… Проста пасьлядоўныя крокі. А наконт надзеі — галоўнае залежыць ад мастака і ад разуменьня ім сваёй аўдыторыі.

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

Ігар Сукманаў: Старыя майстры, прэзэнтаваныя на фэстывалі, — Кустурыца, Вонг Карвай, Пэдра Альмадовар, Таранціна, браты Коэны — дэманстравалі найвышэйшы пілятаж стомленых стылістаў. Іхнія карціны ўжо ня так дзейнічаюць. Няма той лёгкасьці, якая была.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



WWW.MICHAELMOORE.COM

**Кадр з фільму «11 верасьня па Фарэнгейту». Ахоўнік не пускае Майкла Мура да пасольства Арабскіх Эміратаў у ЗША.**

**Запомніце гэтыя назвы: «11 верасьня па Фарэнгейту» Майкла Мура, «Стары хлопчык» Парк Чан Вука, «Выгнаньнікі» Тані Гатліфа, «Трапічная хвароба» Апічатпонга Веерсакула, «Сытыя часы прайшлі» Ханса Вайнгартнэра.**

## Не прапусьціце добрага кіно

**«Гэта тваё жыцьцё».** Швэцыя, 1966. Бліскучы шэдэўр Яна Труэля ў Віцебску **15 чэрвеня** ў кінатэатры «Спартак». Фільмы Яна Труэля будуць ісьці ў Віцебску **11—15 чэрвеня**.

**«Эль Капітана — швэдзкі рэквіем».** Швэцыя, 1991. Адмысловая крымінальная драма Яна Труэля ў Менску — кінатэатар «Перамога», **16 чэрвеня**.

Пра сустрэчу клясыка швэдзкага кіно зь беларускімі студэнтамі чытайце ў наступным нумары «НН».

## Фэстываль беларускай культуры ў Вроцлаве

**З 10 да 13 чэрвеня** ў Вроцлаве (Польшча) — беларускія дні. Выступяць Віктар Шалкевіч, «Стары Ольса», ансамбль «Белыя Росы», гарадзенскія тэатар лялек і капэла, піяніст Кірыла Кедул, гітарыст Уладзімер Захараў, адбудуцца вэрнісажы мастакоў.

## Канцэрты

### Беларускія песьняры

На стадыёне «Дынама» **17 чэрвеня** — вялікі канцэрт ансамблю «Беларускія песьняры», прысьвечаны 60-годзьдзю вызваленьня Беларусі.

### Брыль-бразэрз-джаз-квінтэт

У Тэатры юнага гледача **24 чэрвеня** — канцэрт саксафаністаў, братоў Сэма і Дж.Брылі (Ізраіль—Масква) «Брыль-бразэрз-джаз-квінтэт» зь міжнароднай прэм'ерай «Прывітаньне Чарлі Паркеру!». Т.: 239-79-77.

## Выставы

### Дызайн-біржа

**15 — 18 чэрвеня** на Я.Купалы, 27 адбудзецца 2-я міжнародная выстава «Дызайн-біржа». Да ўдзелу запрошаны вольныя мастакі, дызайнэры, фатографы, архітэктары, праекціроўшчыкі, канструктары і вынаходнікі, а таксама дызайн-студыі, архітэктурныя бюро, арт-галерэі, выдавецтвы.

### Дыплёмныя работы

У Палацы Рэспублікі працуе выстава дыплёмных работ студэнтаў катэдры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Ўнівэрсытэту культуры: габэлены, саломка, дэкаратыўны росьпіс, ткацтва. Уваход вольны.

### Акварэлі Тараскінай

**Да 11 чэрвеня** ў галерэі «Славутыя майстры» (Траецкае прадмесьце, Камунальная набярэжная, 6) працуе выстава акварэляў Натальлі Тараскінай «Пэрсанажы».

### У галерэі Шчамялёва

У мастацкай галерэі Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) **да 26 чэрвеня** працуе выстава жывапісу Людмілы Шчамялёвай і Ігара Рымашэўскага.

### Лялькі і людзі

У гасьцёўні Галубка **да 30 чэрвеня** працуе выстава «Лялькі і людзі», прысьвечаная 50-годзьдзю галоўнага мастака Беларускага тэатру лялек Валер'я Рачкоўскага. Т.: 286-74-03.

## Тэатры, Філярмонія

### Купалаўскі тэатар

**10** (чц), **11** (пт), **12** (сб) — «Эрык XIV», прэм'ера.

**Малая сцэна**

**13** (ндз) — «Салямэя».

**14** (пн) — «Баляда пра каханьне».

**На сцэне Купалаўскага**

Берасьцейскі тэатар драмы і музыкі пакажа менскім гледачам: **17** (чц) — «Дзядзя Ваня», **18** (пт) — «Рэвізія» паводле «Рэвізору» М.Гогаля, **19** (сб) — «Рамэо і Джульета», **20** (ндз) — «Кравец» С.Мрожака.

**Гастролі купалаўцаў**

На сцэне Берасьцейскага тэатру драмы і музыкі адбудуцца спэктаклі: **17** (чц), **18** (пт) — «Каханьне ў стылі барока», **19** (сб) — «КІМ», **20** (ндз) — «С.В.».

### Опэра

**10** (чц) — «Сэвільскі цырульнік».

**16** (ср) — Вечар старадаўняга рамансу.

**19** (сб) — «Вясельле Фігара».

### Балет

**17** (чц), **18** (пт) — «Шчаўкунок».

### Тэатар Горкага

**9** (ср) — «Амфітрыён».

**10** (чц) — «Суцяшальнік удоў».

**11** (пт) — «Анджэла ды іншыя».

### Музычны тэатар

**10** (чц) — вечар балету: «Кармэн-сюіта», «In Pivo Veritas».

**14** (пн) — «Прынцэса цырку».

**15** (аўт) — «Севастопальскі вальс».

**16** (ср) — «Даратэя».

**17** (аўт) — музычнае шоў «Галяктыка каханьня».

**20** (ндз) — «Жызэль».

### Заля камэрнай музыкі

**11** (пт) — аўтарскі вечар кампазытаркі Ганны Кароткінай.

**11** (пт) — улюбёныя старонкі музычнай гасьцёўні. Пачатак у 21.30.

**14** (пн) — ляўрэаты міжнародных конкурсаў Я.Віданаў — флейта, А.Гур — саксафон, В.Сідараў, М.Лапацін — фартэпіяна.

**15** (аўт) — вечар вакальнай музыкі. Г.Паўлянок — мэцца-сапрана, А.Афанасьева — фартэпіяна.

**18** (пт) — канцэрт арганнай музыкі. К.Шараў.

### «Дзе-я»

**16** (ср) — «Дазвольце мець надзею».

## Клюбнае жыцьцё

### Рэактар

**11** (пт), 19.00 — канцэрт «Nocturnal mortum» (Украіна) + падтрымка: «Astrofaes» (Харкаў), «Weeping twilight» (Менск). Квіткі: 10000—13000. Т.: 8-029-636-80-01.

### Bronx

**10** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Dust.

**11** (пт), 22.00 — live Jazz: Flat.

**12** (сб), 22.00 — dj Dust, dj Laurel.

### Белая Вежа

**10** (чц), 22.00 — «White Tower party». dj Top & dj Grizzly.

**11** (пт), **12** (сб) 22.00 — dj Mixell (europop), go-go.

**13** (ндз), 22.00 — dj Alex, dj Dee (europop), go-go.

### Гудвін

**10** (чц), 21.00 — жывая музыка.

**11** (пт), 21.00 — жывая музыка.

### Madison

**11** (пт), 22.00 — dj Romeo (Absinth, Санкт-Пецярбург). Go-go «Тымур і яго каманда» («Гараж», Zeppelin, Масква).

### X-Ray

**11** (пт), 22.00 — dj Бэргама (house).

**12** (сб), 22.00 — dj Антонов (house, tribal).

### Ямайка

**11** (пт), 21.00 — Preparty + After party.

**12** (сб), 3.00—7.00 — After party.

## Кінаафіша

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **11** (пт) 13.00, 14.00, 15.40, 16.40, 18.20, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 10.30 (іл), 13.00, 14.00, 15.40, 16.40, 18.20, 21.00.

«Барвовыя рэкі-2: анёлы Апакаліпсысу»****: **11—13** (пт—ндз) 19.20, 21.10.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Троя»: **11—13** (пт—ндз) 17.15, 20.30.

«Пітэр Пэн»: **11** (пт) 14.30; **12, 13** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Троя»: **11, 13** (пт, ндз) 15.00, 18.00, 21.00; **12** (сб) 15.00 (іл), 18.00, 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **11** (пт) 15.20, 18.10, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 15.20 (іл), 18.10, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Гары Потэр і вязень Азкабану» (прэм'ера): **11** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)

«Пітэр Пэн»: **11** (пт) 15.00; **12, 13** (сб, ндз) 15.00 (іл).

«Мільён год да нашай эры»: **11—13** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Троя»: **11** (пт) 14.40, 17.50, 20.50; **12, 13** (сб, ндз) 14.40 (іл), 17.50, 20.50.

**«Піянер»** (227-64-87)

«Егер»: **11** (пт) 17.00; **12, 13** (сб, ндз) 17.15.

«50 першых пацалункаў»: **11** (пт) 19.00, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 15.25, 19.10, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Коньнік па імені «Сьмерць» (прэм'ера)***: **11** (пт) 13.00, 15.00, 19.00; **12, 13** (сб, ндз) 11.30 (іл), 14.00, 18.40.

«Брудныя танцы-2» (прэм'ера)***: **11** (пт) 17.00, 21.10; **12, 13** (сб, ндз) 16.30, 21.00.

Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзетак

### тэатры

**«Дзе-я»**

**10** (чц), **17** (чц) — «Зачараваная прынцэса».

**15** (аўт) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

**16** (ср) — «Чароўная скрыпка».

**Музычны тэатар**

**13** (ндз), **20** (ндз) — «Бурацінa.by».

**Тэатар юнага гледача**

**11** (пт) — «Парсюк, які сьпявае».

**14** (пн) — «Дзень народзінаў ката Леапольда».

**15** (аўт), **16** (ср) — «Каліф-башмачнік».

### Кінатэатры

**«Аўрора»**

«Ліла і Стыч»: **11** (пт) 10.30; **12, 13** (сб, ндз) 12.00.

«Цуды ў Рэшатаве»: **11** (пт) 11.00.

**«Берасьце»**

«Маленькі Сьцюарт-2»: **11** (пт) 10.30; **12, 13** (сб, ндз) 11.30.

**«Дружба»**

«У пошуках Нэма»: **11** (пт) 11.00, 13.00; **12, 13** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір»**

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **11—13** (пт—ндз) 13.00.

«Цімур і ягоныя камандас»: **11—13** (пт—ндз) 10.30.

**«Перамога»**

«Зоркавыя сёстры»: **12, 13** (13.00).

**«Піянер»**

«Дзяўчынка шукае бацьку»: **11** (пт) 10.20.

«Ледавіковы пэрыяд»: **11** (пт) 14.20; **12, 13** (сб, ндз) 10.30.

«Русалачка»: **11** (пт) 12.20; **12, 13** (сб, ндз) 12.10.

«Прыгоды піратаў у краіне агародніны»: **12, 13** (сб, ндз) 13.50.

**«Цэнтральны»**

«Нязнайка на Месяцы»: **11** (пт) 11.00.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Магічная казка для нядобрых сноў

Аўтарка «Гары Потэра» Джаан Роўлінг абяцала, што новыя гісторыі пра юнага чараўніка зробяцца змрачнейшымі, але ніхто не чакаў, што ў кіно гэта адбудзецца так хутка.

Трэцяя сэрыя магічна-школьных казак, пастаўленая Альфонсам Куаронам, не хавае свайго сваяцтва зь фільмамі жахаў. Мокрая й цёмная атмасфэра, рыпы, гарбун з гатэлю, гаваркія і страхалюдныя галовы і, нарэшце, зданепадобныя дэмэнтары, само зьяўленьне якіх абстаўлена як атракцыён страху. У такіх умовах рэй у фільме вядуць маргінальныя асобы — няправільны прафэсар-ваўкалак (Дэйвід Цьюліс), хіпушная прарочыца Трэлані (Эма Томпсан) з траўкаю і пад трансам ды хросны бацька Гары Потэра — бліхасты Сырыюс Блэк у выкананьні вечнага вампіра і псыхапата Гары Олдмана.

У гэтую пашаноўную кампанію выдатна ўпісваецца Клякотная Вярба, крыважэрныя звычкі якой лейтматывам праходзяць праз усю карціну, а сварлівы абрыс упрыгожвае пэйзаж.

Галоўныя героі, што часта здараецца з экранізацыямі, крыху прайграюць у глыбіні, але гэта напоўніцу кампэнсуецца відовішчнымі эфэктамі кінакарціны. Пераўтварэньня прафэсара Люпіна ў ваўкалака дзеткі не забудуць і месячнай ночкай, таму я ня раіў бы вадзіць на фільм самых маленькіх.

**Андрэй Расінскі**

«Гары Потэр і вязень Азкабану» («Harry Potter and the Prisoner of Azkaban») ЗША, 2004, каляровы, 140 хв.
**Жанр:** Казка
**Адзнака:** 6,5 (з 10)




● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

**Баршчэўскі Я. Лісты да Юліі:** Вершы, баляды / Пер. А.Канапелькі. — Віцебск, 2003. — 36 с. 200 ас.

Выданьне, прысьвечанае памяці Анатоля Канапелькі — дасьледчыка й перакладчыка творчасьці Я.Баршчэўскага, знаёміць зь лірыкай каханьня пачынальніка новай беларускай літаратуры. Большасьць з журботна-ўзьнёслых вершаў, што ўвайшлі ў нізку, маюць дакладнага адрасата — Юлію Корсак, каханую паэта.

**Бугаёў Дз. Зброяй сатыры, зброяй праўды.** — 2-е выд., выпраўл. і дап. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 316 с. 1000 ас.

Перавыданьне кнігі пра Кандрата Крапіву.

**Быкаў В. Выбраныя творы** / Прадм., уклад. М.Тычыны. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 672 с. — (Беларускі кнігазбор). 2000 ас.

У «Залатой бібліятэцы Беларусі» выйшаў том Васіля Быкава. Сюды ўключаны аповесьці «Трэцяя ракета», «Знак бяды» й «Аблава», выбраныя апавяданьні, публіцыстыка ды ўспаміны клясыка.

**Быкаў на Свабодзе** / Рэд. і ўклад. С.Навумчык. — Радыё Свабодная Эўропа, 2004. — 536 с.: іл. — (Б-ка Свабоды).

«Надвячоркам кожнага дня я ўключаю прыймач і шукаю «Свабоду». Тое сталася звычаем і патрэбай душы», — такія словы Васіля Быкава ўзятыя за эпіграф да кнігі, што сабрала радыёвыступы вялікага празаіка. Складальнікі імкнуліся да максымальнай паўнаты й дакладнасьці — усе быкаўскія выступы падаюцца так, як яны прагучалі. Ахоп матэрыялу надзвычайны: на старонках зборніку асьветлены дзясяткі падзеяў, у якіх браў удзел або камэнтаваў якія В.Быкаў, названы дзясяткі імёнаў. «Беларусь», «Швэцыя й Фінляндыя», «Нямеччына», «Чэхія», ізноў Беларусь, але ўжо «Беларусь пасьля Быкава» — гэткія разьдзелы вылучаны, паводле храналёгіі, у кнізе. Каштоўнасьць зборніку надаюць і ўнікальныя здымкі 1990—2003, большасьць зь якіх друкуецца ўпершыню.

**Бычкоўскі А. Горад за 101-м кілямэтрам** / Другі фронт мастацтваў. — Менск: Логвінаў, 2004. — 120 с. 300 ас.

Твор для аматараў жанру «фэнтэзі».

**Ёрш С. Рыцар Свабоды: Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі як ідэоляг і арганізатар беларускага нацыянальнага антынацысцкага супраціву:** Спэц. выпуск часопісу «Беларускі Рэзыстанс». — Менск, 2004. — 72 с.: іл. 299 ас.

**Жаўі А., Бакры Ж.-П. Сямейнае падабенства; Булянжэ Д. Вясельная вандроўка; Вэбэр Ф. Вячэра з дурнем:** Драмат. творы / Пер. з франц. Ю.Пятрушачкінай, М.Шакеля, З.Коласа. — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2004. — 188 с. — (Б-ка французскай драматургіі). 300 ас.

Сучасная вартасная французская драматургія — па-беларуску. Выданьне ажыцьцёўлена пры падтрымцы Міністэрства замежных справаў Францыі. Пытайцеся на кніжнай выставе ў БНФ.

**Менскае гета 1941—1943: Трагедыя. Гераізм. Памяць** / Гістар. майстэрня ў Менску; Рэд. К.Козак. — Менск, 2003. — 208 с. 100 ас.

Трагедыя ў Трасьцянцы, мэтады й практыка адносінаў з габрэйскім насельніцтвам падчас акупацыі, гісторыя Баранавіцкага й Менскага гетаў — тэмы артыкулаў зборніку.

**Музэй старажытнабеларускай культуры:** Альбом / Уклад. А.Ярашэвіч. — Менск: Беларусь, 2004. 3000 ас.

Створаны ў 1977 г. як навуковы аддзел Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру, сёньня Музэй старажытнабеларускай культуры ўяўляе сабою скарбніцу ўнікальных узораў беларускай матэрыяльнай спадчыны. Тут захоўваюцца сабраныя падчас этнаграфічных экспэдыцыяў жывапісныя й іканапісныя працы, мармуровыя й разьбяныя скульптуры, ручнікі й народныя строі, прадметы побыту, кераміка. Некаторыя з экспанатаў цудам ўратаваныя ад зьнішчэньня ў савецкія гады. Апошнія здабыткі музэю — звыш 2000 помнікаў народнага майстэрства, сабраных у чарнобыльскай зоне. Каляровыя ілюстрацыі альбому дазволяць пазнаёміцца з нацыянальнымі каштоўнасьцямі з фондаў установы. Мяркуецца таксама, што сёлета пры падтрымцы ЮНЭСКА зьявіцца мультымэдыйны дыск, прысьвечаны музэю. Цана 18300 руб.

**Навуменка І. Зьмітрок Бядуля.** — 2-е выд. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 227 с. 2000 ас.

**Падокшын С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI—XVII стст.** / Нав. рэд. А.Майхровіч. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 151 с. 1000 ас.

У дасьледаваньні пададзена карціна маральнай сьвядомасьці беларускага грамадзтва XVI—XVII ст. Аўтар аналізуе этычныя погляды выкладчыкаў праваслаўных брацкіх школ і каталіцкіх навучальных установаў, этычна-філязофскія ўяўленьні пратэстантаў. У разьдзеле «Этычны сэнс айчыннай палітычна-прававой думкі» разгледжаны суадносіны маралі й права ў граматах вялікіх князёў літоўскіх і ў славутым Статуце. Цана выданьня — каля 4000 руб.

**Санько В. Гаворыць — стары Рым, гаворáць — пра Стары Рым:** Афарызмы, прымаўкі, максымы: Лац., расейск., бел. мовы / Навук. рэд. І.Грамыка. — Менск: БВТ «Хата», 2003. — 380 с.: іл. 750 ас.

Часам трапнасьцю й мудрасьцю сваіх выказваньняў звычайны беларус ні ў чым не саступіць антычным філёзафам, гісторыкам ды дзяржаўным дзеячам. Сабраныя аўтарам прыклады з сучаснай беларускай гаворкі — яскравае таму сьведчаньне. У «Акадэмічнай кнізе» цана выданьня 9600 руб.

**Ялугін Э. Альжырская пастка:** Гістарычны крымінальны раман. — Вільня: Наша будучыня, 2004. — 272 с. 500 ас.

Дэтэктыў вяртае чытача ў недалёкую мінуўшчыну — савецкія й першыя постсавецкія гады. Шукайце на выставе ў ТБМ.

**Адамович А. Хатынская повесть. Каратели.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 446 с. 2000 ас.

**Козлович А. Белорусы между небом и землёй:** Хроники Анатолия Козловича. Публицистика. — Смоленск: Скиф, 2003. — 624 с. 1000 ас.

Кніга, задуманая аўтарам як аўтабіяграфічная, ствараласяцягам 1998—2002. Сярод герояў расповеду — і шараговыя беларусы, лёс якіх адлюстроўвае ўсю незайздроснасьць сёньняшняй сытуацыі, і асобы, што нясуць непасрэдную адказнасьць за сацыяльна-эканамічнае становішча. «У змрочныя вынікі беларуса трэба тыцкаць носам, інačай шмат што да яго не даходзіць», — зазначае публіцыст. Па меры напісаньня матэрыялы кнігі друкаваліся ў «Народнай волі» й «Свободных новостях» ды расейскай «Литературной газете».

**Память и слава: К 75-летию со дня рождения А.Е.Супруна** / Рэд. Г.І.Шаўчэнка. — Менск: БДУ, 2003. — 148 с.: іл. — (Memoria et Gloria). 200 ас.

Выданьне прысьвячаецца філёлягу-славісту, дасьледаваньні якога здабылі сусьветнае прызнаньне.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Прыз за гомельскі блюз

**У чацьвёрты раз беларускія музыкі паўдзельнічалі ў міжнародным конкурсе выканаўцаў-аматараў на XIV фэстывалі «Noc Bluesowa» ў польскім горадзе Рава Мазавецка. І другі год запар не засталіся без узнагарод: маладзюткі гітарыст і вакаліст Аляксандар Бондараў з Гомелю здабыў спэцыяльны прыз журы.**


ДЗЬМІТРЫ ПАДБЯРЭСКІ

Граюць два Аляксандры — Бондараў (зьлева) і Цыганок

Гэтым разам беларуская дэлегацыя складалася з канкурсантаў — дуэту «1 блюз 1» і гасьцей — знанай групы «Mojo Blues», узмоцненай лідэрам групы «Svet Boogie Band» Сьвятаславам Хадановічам.

У конкурсе ўдзельнічалі 10 каманд з Польшчы, Чэхіі, Вугоршчыны, Славаччыны, Нямеччыны й Беларусі. Пры гэтым беларусам давялося на хаду мяняць склад: замест аднаго з удзельнікаў дуэту мусіў іграць настаўнік практычна ўсіх гомельскіх блюзмэнаў гітарыст Аляксандар Цыганок. Аляксандар Бондараў — адзін зь ягоных вучняў, якому яшчэ ня споўнілася 17 гадоў. Аднак стаіць ён у блюзе трывала і грунтоўна, займаючыся выкананьнем пераважна карэннага рэпэртуару з дэльты Місісыпі. Нягледзячы на безумоўную маладосьць і адсутнасьць у біяграфіі нейкіх узрушэньняў, якія й дазваляюць ператварыць блюзавае выказваньне ў своеасаблівы маналёг пра лёс і пра сябе, ён выдатна адчувае спэцыфіку гэтай музыкі, яе ўнутраны сьвет, мае добрае адчуваньне стылю. Сьпявае, выкарыстоўвае слайд і, што найбольш істотна, літаральна жыве гэтай музыкай. Усё гэта ў сукупнасьці і прадыктавала выбар міжнароднага журы, якое адзін з двух спэцыяльных прызоў і прысудзіла будучыні беларускага блюзу. А мясцовая FM-станцыя «RSC» адарыла яшчэ і навarочанай магнітолай.

«Mojo Blues» выступілі ў гасьцявой праграме вельмі ўпэўнена. Гэтая каманда мае трывалы аўтарытэт на польскім рынку. Паводле вынікаў анкеты польскага квартальніка «Twyj Blues» за 2003 г., група апынулася на 18-й пазыцыі ў намінацыі «Замежныя калектывы — адкрыцьцё году», а гітарыст Ільля Шэўчык апынуўся на 55-й пазыцыі ў сьпісе найлепшых замежных гітарыстаў, што зусім нядрэнна: Джон Скофілд, напрыклад, стаіць у анкеце на дзьве пазыцыі ніжэй за Шэўчыка. Усё гэта, вядома, даволі ўмоўна, але адразу ж пасьля «Nocy Bluesowej» менчукі выправіліся на працяглую клюбную трасу па поўдні Польшчы, якая прадугледжвала шэсьць ці сем канцэртаў. А вось гэта ўжо — рэч рэальная.

Што датычыць Сьвета і ягонага «Бугі-бэнду», дык літаральна ў той жа дзень, як ён вярнуўся з Польшчы, Сьвет разам са сваёй камандай выехаў у Маскву на два клюбныя канцэрты, каб адразу па іх паехаць у Чэхію на вельмі прэстыжны блюзавы фэстываль «Блюз у лесе».

Вяртаючыся да «Nocy Bluesowej», паведамлю, што конкурс гэтым разам выйграла польская каманда з Глівіц «Teenage Beat», другое месца занялі славакі «Mojo & Mahortu Band», трэцяе — палякі са Шчэціна «Lost in Blues». Сярод гасьцей фэстывалю адзначыліся, між іншымі, Эльжбэта Мельчарак, якая дагэтуль не выступала амаль 20 гадоў, і вугорская група «Zsolt Benko & Bluesrivers».

Тамсама, у Раве Мазавецкай, адбыліся дзелавыя перамовы з галоўным рэдактарам часопісу «Twój Blues», вынікам якіх павінен стаць прыезд увосень у Менск з канцэртам адной зь вядучай блюзавых груп Польшчы. Ня ўвесь жа час беларусам паказваць клясу ў Польшчы. Варта, каб і палякі паказаліся ў Беларусі.

**Дзьмітры Падбярэскі**

# Не трывай




«БН». «БМА-груп», 2004

Сытуацыя ў беларускай музыцы нечым падобная да палітычнай сытуацыі: усё тыя самыя твары — пераемнікаў ці вартых кандыдатаў на вышэйшую пасаду вобмаль. Гурт зь Бярозы пад немудрагелістай назвай «БН» (трэба думаць, «Бяз назвы») мог бы зь цягам часу вылучыць сваю кандыдатуру на рок-каралеўскі пасад, калі яго ўдзельнікі ня будуць ленавацца. Прынамсі, дэбютны іх альбом «Не трывай» шматабяцальны: запамінальныя мэлёдыі, музычны нэрв, някепскі ўзровень валоданьня інструмэнтамі, не абы-якія вакальныя дадзеныя лідэра гурту Алеся Лютыча. Безумоўна, хібы ёсьць. Асноўны — банальныя тэксты: усё круціцца вакол адвечнага «жыцьцё і сьмерць». То вакаліст сьпявае пра вечнае жыцьцё (трэк «Жыць»), то зацягвае «сьмяротную разьвітальную»: «Цудоўным восеньскім вечарам я раптоўна вазьму і памру» («Я памёр»), і ў наступнай песьні такая ж гісторыя: «Ты памерла сама, а мне тут жыць навошта?» Такая во дэпрэсіўнасьць.

Чуюцца месцамі водгукі «Мясцовага часу» (асабліва трэк «Заўсёды з табой»), месцамі — «лявоншчына». Падаецца, што не стае хлопцам свайго матэрыялу — ад таго, напэўна, і ўцiснулі ў плытку кавэры на «N.R.M.» («Дзед Мароз») і на «Палац» («Канюшня»). Дый песень на дыску ўсяго на 40 хвілін…

Але, як для старту, то альбом някепскі. Пажаданьні — не застацца на ўзроўні хлапечай гард-рок-каманды ды працаваць над тэкстамі больш удумліва.

Адзнака — 7 (з 10)

**Сяргей Будкін**

# Happy with the Boogie




Svet & Al Boogie Band. (p) 2004 «Svet & Al Boogie Band»

Застаецца толькі зьдзіўляцца з тэмпаў мастацкага сталеньня, якія дэманструюць Сьвет і Эл — маладыя музыканты, якія рызыкнулі выказвацца ў рэпэртуары, больш характэрным для прыгнечанага бавоўняными плянтатарамі народу. Праўда, паралель усё ж існуе: мурыны клалі жыцьцё на бавоўняных палях, беларусы робяць тое самае, але на калгасных бульбоўніках. І многія нашыя народныя песьні ад таго куды больш тужлівыя, чым заакіянскія блюзы.

Год таму амаль што дэбютанты Сьвет, Эл і Біг Вэл выйгралі міжнародны блюзавы конкурс у Польшчы. Сёлета яны зрабілі некалькі ўдалых выступаў у маскоўскіх блюзклюбах і выдалі чарговы альбом, гэтым разам вытрыманы амаль цалкам у стылістыцы бугі-вугі. Выкананьне можна назваць узорным — і адначасова надзвычай узьнёслым і лёгкім. Але што найбольш істотна — гэтыя музыкі адчуваюць сябе ў абраным стылі надзвычай утульна, нібыта самі толькі што выпаўзьлі зь якога наседжанага «начнымі матылямі» і бутлегерамі амэрыканскага шынка канца XIX ст. Ніколі, прызнацца, не даводзілася чуць у выкананьні нашых музыкаў гэткага стылёвага ўвасабленьня чужой нам музыкі.

Альбом пакідае ўражаньне надзвычай упэўненай і дакладнай работы. Адно шкада: музыка — усяго толькі адсоткаў пяцьдзясят таго вобразу, які мае ансамбль на сцэне падчас жывога выкананьня.

**Бугой Слухач**


## БУДЗЬ СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

**Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў 8—11 клясаў сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзамэнаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія. Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі. Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў. Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59. Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.**



ARCHE

твой любімы часопіс

падпісны індэкс 00345



Цяпер у новым абліччы і праз падпіску

Паўліна Качаткова



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

навэла

# Вучні

Апошні дзень лістапада быў надзвычай цёплы, бязь сьнегу.

У двары красавала прымула. Наіўная. Яна і раньняй вясной першая вытыркаецца, калі яшчэ невядома, што да чаго. Але ня толькі прымула зьдзіўляла неабачлівасьцю — сад не пазбыўся колераў: з-пад плоту вызіралі фіялетавыя лясныя фіялкі, дый трава зусім зялёная. І гэта ў той час, як гіяцынты, касачы і яшчэ некаторыя галяндзкія цыбульныя расьліны ўжо надзейна схаваныя пад дробным драўляным пілавіньнем — падрыхтаваныя да зімы: ужо час. Кажуць, у гэты год і пчолы падмануліся восеньскім цяплом — вылецелі шукаць мёд. Мёду няма. Шмат зь іх загінула. Таксама наіўныя.

На цёплай кухні пад каньяк з пэрсыкавай гарбатай мы гаварылі з дасьведчанай настаўніцай пра жыцьцё і вучняў. Ці можна сказаць яшчэ — пра жыцьцё навучальнай установы, якую наведваюць выключна хлопцы.

У газавай калёнцы шугала полымя, на буфэце ляжалі белыя кот і котка — маці і сын з пухнатымі хвастамі. Я глядзела, як гайдаецца адбітак верхавіны вярбы ў буфэтным шкле, і слухала...

— На ўроку яны нешта чытаюць і чытаюць, і так ім весела. Я доўга не зьвяртала ўвагі, але гляджу, што яны так знарок чытаюць, каб я пабачыла. Урэшце мая цікаўнасьць узяла верх. Я забрала гэты сшытак. Паглядзела, а там такое.... Напісана пра маю каляжанку — паважаную настаўніцу біялёгіі. Крывымі літарамі напісана, што б ён хацеў зь ёй зрабіць — і як бы ён яе хацеў. Я, вядома: «Аааа...» Як выглядае мая каляжанка настаўніца біялёгіі? Высокая жанчына, пышная, з тонкай таліяй, на крэпкіх нагах. Такая супэржанчына пад пяцьдзясят.

— А той, хто пісаў крывымі літарам, ён хто?

— Нехта зь іх. Магу толькі здагадвацца адносна аўтарства. Я, безумоўна, абурылася і спытала: «Хто напісаў?» Яны яшчэ больш разьвесяліліся і паказалі на дробнага хлопчыка — сына майго былога вучня. Яны з бацькам вельмі падобныя. Увесь час іх блытаю, называю малога «Віцем», а ён крыўдзіцца і кажа: «Я Саша, а Віця — гэта мой бацька». Тата ў яго быў харошы хлопчык, праўда, таксама сядзеў на ўроках і ўсё нешта ці то пісаў, ці то маляваў — незразумела было, што адбываецца ў гэтай галаве, бачыць ён рэчаіснасьць ці яму мроіцца нешта далёкае, але прыемнае. Так я спытала: «Хто зрабіў?» Яны ўзрадаваліся і ўсё зьвярнулі на гэтага маленькага Сашу. Я сказала, што яны, напэўна, яго «падстаўляюць». Падозраньне ў мяне было на аднаго хлопца зь вёскі. Карацей, я зь імі пагаварыла, яны быццам бы супакоіліся. Але чорт мяне ўзяў паказаць сшытак настаўніцы расейскай мовы. А яна: «Мяне як варам аблілі, гэта асабістая абраза і для мяне, як для жанчыны!» Сказала, што бачыла, як яны ўсе гігікалі ў сталовай і, відаць, ізноў абмяркоўвалі ўсё гэта. Карацей, яна запатрабавала выклікаць тату. Тата (цяпер тоўсты п'янаваты дзядзька) прыйшоў і сказаў: «Мы зь ім разабраліся, гэта ня ён. Сапраўды, яны яго падставілі». Але скандал разгарэўся вялікі, я ўжо пашкадвала, што не змаўчала. На наступны дзень мне ісьці на працу, першы ўрок у гэтай групе, а ў мяне ўвесь твар апух, на наступны дзень я па дарозе падвярнула нагу. Працаваць не магла. Распавяла пра гэта настаўніцы расейскай мовы, а яна вельмі своеасабліва адрэагавала: «А ты ня думаеш, што гэта той хлопчык табе такое падстроіў?» Цікава — якім чынам? Але, калі б я гэтага сшытка не паказвала нікому, — усё сышло б на тым узроўні, што пагігікалі — і ўсё. Але яна сказала, што яе абразілі як жанчыну, сказала «я не дазволю». Я ўпэўненая, што такія фантазіі ў іх часта нараджаюцца на занятках. Яшчэ і як нараджаюцца! Яшчэ і якія! Але яны ж звычайна гэта хаваюць. Толькі часам нешта выяўляецца. Любяць шакаваць настаўніц якімі-небудзь малюначкамі. Аднойчы прынесьлі брэлок у выглядзе пэўнага органа. Круцілі яго. Яны думаюць, што мы ад гэтага будзем нэрвавацца. І ў адносінах да настаўніц ёсьць фантазіі. Ёсьць, вядома. Але ж яны не паказваюць. Яны скрытныя. Вось з гэтым сшыткам я ўлавіла першы раз. Вядома, самае цікавае тут — аб'ект. А яшчэ ў нас ёсьць настаўніца — Булачка — так яны яе называюць. Яна ўвесь час гаворыць, як яны яе «абагаўляюць»: «Яны хочуць наблізіцца да мяне, хочуць да мяне дакрануцца. Я так і адчуваю, як яны прагнуць да мяне дакрануцца». Ёсьць тут, напэўна, нешта... А раней, калі не было адпаведных часопісаў, яны малявалі. Так, на шкле ў адной з аўдыторыяў зьявіўся сылюэт палеалітычнай Вэнэры. Як у перашабытнай пячоры. Такія Вэнэры ў эпоху палеаліту былі распаўсюджаныя ад Сібіры да Заходняй Эўропы — выявы жанчын з падкрэсьленымі прыкметамі полу, галава практычна адсутнічае, ручкі колцам, але ўсе астатняе падкрэсьлена — ці то сымбаль урадлівасьці, ці то праява эратычных памкненьняў першабытных паляўнічых. Аднойчы я выявіла чарговы малюнак і кажу: «Вам яшчэ не надакучылі гэтыя пышныя формы?» А яны кажуць: «Гэта ў Вас няма пышных формаў, таму вы зайздросьціце». А самы першы малюнак на шкле зроблены ў нашай установе амаль трыццаць гадоў таму... Ён ужо ледзь заўважны, яго ўжо амаль ніхто не заўважае, але шкло захавалася, а на ім абрысы Вэнэры. Я табе кажу, іх малюнкі — тыповы палеаліт...

* * *

Котка мякка скокнула з буфэта, за ёй сьледам зваліўся малады кот, яны прабеглі праз кухню і зьніклі ў фортцы. Прыйшоў час прагляду вечаровага сэнтымэнтальнага сэрыялу на TV.

Міраслаў Адамчык




## Наш дэтэктыў

# Партфэль

Вадзім Карцаў

Джынсы я сабе купляю цаною да 30 даляраў. Кашулі — да 20. Абутак — да 60 (абіраю практычны, на ўсе выпадкі, каб насіць два-тры сэзоны). Гадзіньніку майму, за 40 даляраў, ужо гады чатыры. Калісьці, каб быць маднейшым, пераплаціў за мабілку новае мадэлі: цяпер ёй амаль два гады, прывык да яе і не хачу мяняць; з жахам думаю, што, калі я яе патаплю, згублю ці яна зломіцца, такой самай ужо ня знойдзеш (зьнятая з вытворчасьці). Маю парачку дарагіх гальштукаў, але гэта падарункі; астатнія гальштукі — па 10—20 даляраў. Такім чынам, я мужчынка ашчадны. Пагатоў, да гэтага змушаюць абставіны: працяглы час аддаваў крэдыт, на які набылі кватэру; цяпер будуем дом.

Але пабачыў я ў 2000 г. Чубайсаў партфэль. Гэта было на ўрачыстым адкрыцьці нейкае выставы ў Маскве. Шыкоўны партфэль фірмы «Petek» з рэменем цераз плячо. Чубайс паставіў яго на стол, прамаўляў да публікі. Партфэль увесь час красаваўся на стале. Я разгледзеў нават нітачкі.

Жаданьне набыць такі самы працяло мяне імгненна. У Менску, як ні дзіўна, знайшлося прадстаўніцтва «Petek», але яны не займаліся таварнымі пастаўкамі, а толькі выступалі пасярэднікамі для фірмаў, якія жадаюць імпартаваць галянтарэйныя вырабы і аксэсуары са скуры. Пагартаўшы каталёгі, я ледзь знайшоў той самы артыкул, дзеля якога прыйшоў. Каб спатрэбілася ўкленчыць — укленчыў бы, але офіс-дзядзька бяз гэтага паабяцаў даставіць адзін асобнічак у Менск.

І вось праз колькі тыдняў пакунак шчасьця прыбыў у сталіцу. У кардоннай каробцы ляжаў поліэтыленавы скрутак прыглушана-крывавага колеру. У ім — аналягічнага колеру шчыльнае цяжкое тканіны мяшок з матузкамі, а ў мяшку, акрамя сэртыфікату з нумарам і ключыкаў у аліўнай паперы, — ён, мой партфэль, мая Рэч. Вельмі прашу, не распытвайце, колькі каштуе, бо, дазнаўшыся, шмат хто запіша мяне ў псыхічна нездаровыя. Зрэшты, і гэты аповед ня ёсьць прыметаю маёй нармальнасьці.

На працы, каб не зайздросьцілі, давялося схлусіць, што гэта падарунак багатага брата (якраз нядаўна быў дзень народзінаў). Чорны, з высакародным паліскам, з паліраванаю сталёваю фурнітурай, на чатырох люстраных ножках-цыліндрыках, ён стаў маёй візытоўкай. Куды б я ні завітаў, калі партфэль на плячы — да мяне выключна сур'ёзнае стаўленьне. Дзяржустановы, сэрвісы, офісы і рэдакцыі, аўдыторыі, асьпірантура... Паўсюдна я нахабна стаўлю партфэль на стол і вырашаю пытаньні. З гэтым партфэлем мяне разоў пяць ужо запрашалі на добрыя месцы, у добры бізнэс.

Гадамі партфэль крыху паднасіўся. Ён прапусьціў праз сваё падбітае шоўкам чэрава процьму важных і ня дужа дакумэнтаў, рукапісаў. Ён сябруе з маёю срэбнаю візытоўніцаю (падарунак аднае паненкі) і маім абадраным ды спляжаным шматлікімі штампамі й пячаткамі пашпартам. Ён транспартаваў у сабе неаднойчы буйныя сумы грошай. Ён нюхаў бутэрброды, пакладзеныя маёй клапатлівай жоначкай. Ён прысутнічаў на сакрэтных перамовах, назіраў кампрамэтуючыя мяне дзеі.

Ён стаў маім сябрам. На жаль, мужчын-сяброў у маім жыцьці няма. Хлопцы-суседзі з вуліцы дзяцінства — хто сьпіўся, хто ў турме, хто на заводзе нейкім ці ў Расеі трубы кладзе. Два былыя аднагрупнікі, зь якімі прабавіў юнацтва (упершыню напіўся, упершыню скаштаваў жаночага цела, упершыню зарабіў ладныя «бабкі»), — у Бэльгіі даўно атабарыліся: адзін у стрып-клюбе бармэнам, другі бэушныя «тачкі» перапрадае. Зьявіўся з год таму новы блізкі прыяцель, але ён увесь час заняты: дзьве працы, двое дзяцей...

На шчасьце, маю колькі сапраўдных сяброўак жаночага полу. Яны не даюць мне сумаваць. Здагадваецеся, што я скажу далей? Так! Ім вельмі падабаецца мой партфэль!



# Нас ізноў засудзілі!!!

фэльетон

— …І скончыць нашу сёньняшнюю «Панараму» спэцыяльнае расьсьледаваньне нашага спартовага карэспандэнта Ўладзімера Навінскага. Рэпартаж атрымаў працоўную назву «Міжнародная змова». Перадаём слова аўтару.

— Напярэдадні сёлетняй Алімпіяды ў Атэнах стала вядома, што ў каляспартовых кулюарах МАКу і нашага прэзыдэнта ў прыватнасьці існуе нейкая таемная змова супраць беларускіх спартоўцаў у цэлым і нашага прэзыдэнта ў прыватнасьці. Зірніце самі: перад самымі адказнымі спаборніцтвамі сэзону МАК за ўжываньне допінгу дыскваліфікуе кідальніцу ядра Парольчык, плыўчыху Карасіменю, цяжкаатлета Палішчука — гэта далёка на ўвесь сьпіс ахвяраў несумленнай гульні міжнародных арганізацыяў. Вядома, згаданую праблему можна разглядаць як выключна спартовую, аднак мы зірнём на яе ў кантэксьце глябальнай палітыкі.

З крыніц БТ у Пэнтагоне стала вядома, што справу з дыскваліфікацыяй нашых спартоўцаў старанна распрацавалі ў нетрах амэрыканскіх спэцслужбаў. Выканаваць апэрацыю было даручана Сусьветнаму антыдопінгаваму агенцтву (САКА) і тутэйшым калябарантам, якія за мізэрныя падачкі у.а. гатовыя прадаць ня тое што Радзіму, але і родную матулю. Паводле плянаў спэцслужбаў, калябаранты павінны ўсімі магчымымі шляхамі ўпліхчвацца ў склады нацыянальных зборных па розных відах спорту, а ўжо потым рабіць сваю брудную справу. Пад выглядам «вітамінаў» засланнікі ФБР павінны былі прапаноўваць нашым спартоўцам забароненыя стэроіды. Пераканаўшыся, што допінг быў прыняты па прызначэньні, здраднікі паведамлялі пра гэта ў штаб-кватэру САКА, далей ужо, як любяць казаць нашы спартоўцы, справа тэхнікі. Кампутары САКА у зусім «выпадковым» жэрабі вызначалі нашых атлетаў на праходжаньне допінг-тэстаў. Як вынік тых тэстаў — дыскваліфікацыя на колькі сэзонаў і, адпаведна, пралёт міма Алімпіяды.

Для чаго Амэрыцы такая нізасьць? Адказ надзвычай просты: яшчэ летась наш прэзыдэнт даў загад нашым атлетам выйграць у Атэнах 25 мэдалёў. Падступныя пляны іншаземных спэцслужбаў накіраваны акурат на зрыў гэтага загаду. Невыкананьне яго дазволіла б апазыцыі пляскаць у далоні. І яшчэ фактар: народ, убачыўшы, што кіраўнік дзяржавы ня можа выканаць сваіх абавязацельстваў, захоча сабе іншага правадыра. Вось такімі мэтамі кіруюцца цяпер ЗША і тутэйшыя іх памагатыя.

Аднак нас усё ж не пакідае надзея на здабыцьцё ў Атэнах абяцаных мэдалёў. МАК пляную ўвесьці ўжо на гэтай Алімпіядзе ў праграму спаборніцтваў лыжаролерную эстафэту. Папярэдні адбор у гэтую дысцыпліну адбыўся 15 траўня на праспэкце Машэрава. Неперяможнай на працягу каторага году запар аказалася каманда №1, заключны этап за якую бег сам прэзыдэнт. З такім выніковым часам каманда відавочна будзе спрачацца за золата ў Грэцыі.

Калі ўсё-такі рэпрэсіі супраць нашых спартоўцаў ня спыняцца, Беларусь на гэты выпадак распрацавала альтэрнатыўны варыянт — Алімпійскія гульні ў Менску. Папярэднюю згоду на ўдзел у нашай Алімпіядзе далі спартоўцы Кубы, Лібіі, КНДР, асобныя атлеты зь іншых дзяржаў, якія таксама несправядліва былі абвінавачаны ва ўжываньні допінгу. Як бачым, у сьвеце мы маем шмат сяброў. Між іншым, наступны тыдзень пройдзе пад дэвізам «Пабудуем новы Лядовы палац разам». Дзённыя заробкі ў падтрымку гэтае акцыі згадзіліся перавесьці рабочыя прадпрыемстваў, заводаў і фірмаў краіны. На гэтай аптымістычнай ноце я заканчваю рэпартаж. Сьвятлана?

— Дзякуй, Уладзімер, а я разьвітваюся з гледачамі. Напярэдадні вас яшчэ чакаюць навіны спорту, дзе вы пачуеце падрабязны аповед пра матч каманды прэзыдэнта з вэтэранамі сельскагаспадарчага комплексу Жлобінскага раёну. Да сустрэчы!

**Зьміцер Панкавец**



Людка Сільнова

## Праход Вэнэры па дыску Сонца (Ілюзіі лета)

Да Сонца
Туліцца Вэнэра,
Як дзеўчына
Да кавалера.

— Глядзі —
Кахаюцца плянэты!
— Павер,
Ілюзія і гэта.

Здаецца,
Лашчацца й краіны —
Адно ў вяках пакуль
Ня згінуць...

Пакуль свабодныя —
Жывыя,
О, Беларусь,
Мая Расія!

*08.06.2004*

ГУМАРЭСКА

# БелХаўз

*Разве могут поэта звать
Тодар?*

Эўрапеізацыя ды вэстэрнізацыя — працэсы патрэбныя ды непазьбежныя, асабліва для тых, хто ратуецца ад братэрскае русіфікацыі. Аднак тутэйшыя аўтахтоны нахабна працягваюць захоўваць адмерлыя рэшткі свае псэўдакультуры (мачанку, саламяныя куфэркі ды дзікунскія імёны). З мэтаю захаваньня гуманізму ды дэмакратыі прапаную перапісаць гісторыю нацыянальнае літаратуры, адаптаваць прозьвішчы да сусьветных стандартаў ды заўжды падкрэсьліваць заходнеэўрапейскую арыентацыю творцаў. Пачатковы сьпіс уключае наступных асобаў:

Аліса Натс (Эліза Ажэшка)
Алекс Бітл (Алесь Жук)
Алекс Валкейна (Алесь Гарун)
Алекс Найтынгейл (Алесь Салавей)
Алекс Пэтэрсан (Алесь Пятрашкевіч)
Алекс Рынга (Алесь Звонак)
Алекс Фіст (Аляксей Кулакоўскі)
Аньці (Цётка)
Бэзыл Блэксьміт (Васіль Каваль)
Вэл Трыхома (Валянціна Коўтун)
Грэг Энт (Рыгор Мурашка)
Джо Вуд (Язэп Пушча)
Джон Мідсамэрнайт (Янка Купала)
Джэк Рай (Якуб Колас)
Джон Самбрэра (Янка Брыль)
Долі Элк (Еўдакія Лось)
Кенэт Нэтл (Кандрат Крапіва)
Лео Піджэн (Леанід Галубовіч)
Майкл Сагітарыё (Міхась Стральцоў)
Макс Годгіфтыд (Максім Багдановіч)
Майкл Рыд (Міхась Чарот)
Піт Айброў (Пятрусь Броўка)
Піт Броўкен (Пятро Ламан)
Плюта Хед (Платон Галавач)
Рэй Кеп (Раіса Баравікова)
Софі Чэк (Соф'я Шах)
Тэса Купэр (Таіса Бондар)
Філ Чаплінг (Тодар Кляшторны)

**Мэры Клаўдліт (Болачка)**

# Конкурс

## для маладых журналістаў-аналітыкаў

Беларускі ПЭН-Цэнтар пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «Arche» і «Палітычная сфера» ды Беларускай асацыяцыі журналістаў

абвяшчае конкурс на найлепшы аналіз

## «Выбары-2004: шанцы і прагнозы».

Пераможцаў чакаюць прызы, дыплёмы і майстар-клясы.

На конкурс прымаюцца артыкулы памерам да 15 тыс. знакаў. Працы дасылайце на электронны адрас pen@pen.unibel.by або на адрас: а/с 18, 220050, Менск, з пазнакай «На конкурс». Апошні тэрмін падачы — 25 чэрвеня.

Журы конкурсу: Валер Булгакаў, Андрэй Дынько, Андрэй Казакевіч, Віталь Сіліцкі.

**Запрашаем на падарожжа**
**13** чэрвеня (нядзеля) па маршруце:
**Менск—Сынкавічы—Зэльва—Крамяніца—Ваўкавыск—Гнёзна—Мсьціба-ва—Ізабэлін—Краскі—Менск.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер);
264-12-38, 776-24-35 (Павал).

**Запрашаем у вандроўку**
**13 чэрвеня**
**Мір—Наваградак**



**Мір:** замак (XVI ст.), капліца-пахавальня (1904 г.), Касьцёл Сьв.Мікалая (1594—1604 г.), Траецкая царква (сярэдзіна XVI ст.)
**Наваградак:** Замак (руіны) сярэдзіны XIII ст., Барысаглебская царква (1519 г.), Фарны касьцёл (1712—1733 г.), Сьвята гораду — Наваградку 950 год!
Кошт — 18000 руб. для дзяцей і 21000 руб. для дарослых.
Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70; http://altusplus.narod.ru

# Самая танная «НН»

«Нашу Ніву» зь мінімальнай нацэнкай па цане **550 рублёў** можна купіць у краме УП «Марат».

Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Бацьку** Алеся Ложачніка віншуем з Днём народзінаў! Зычым усяго найлепшага. Сям'я

**Любая Манечка!** Зь Юбілеем віншуем! Хай Анёл і надалей ахінае цябе сваімі крыламі. Аматары піва

**Даражэнькі валацуга**, любыя стасункі — Праўда, калі, аддаючыся цалкам, знаходзіш сябе, а не губляешся ў іншым, — не згубіся канчаткова! З народзінамі!

**Даражэнькі Ія**, віншую з днём нараджэньня, жадаю шчасьця ў асабістым жыцьці. Будзь Асобай — сабой! Да сустрэчы ў Вечнасьці! Puch

**КАНТАКТЫ**

**Вясковы** хлопец шукае беларуску для стварэньня сям'і. Зьніч. Т.: 8-029-766-12-79

**Пазнаёмлюся** зь менчуком 25—35 гадоў — разумным, адукаваным, мэтанакіраваным. Маю шмат станоўчых якасьцяў. А/с 270, 220050, Менск

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

**Шукаю спадарожніцу** для вандровак па цікавых мясцінах Беларусі. Электронны адрас: Nemanina@tut.by

**Бел-чырвона-белыя сьцягі** цяпер можна набыць у Віцебску! Розныя памеры, з выявай «Пагоні». Т.: 8-029-712-83-88, 8-029-715-53-89

**Заходзьце** на сайт МІ «Вока»: http://www.voka.tk

**Афіцыйны** сайт праекту «Штурм FM»: www.fmby.tk. Заходзьце!!!

**Галасуй** за беларускую мову на www.myminsk.com. Патрэбен Ваш голас!!!

**Галасуй** за лепшых: www.vokamusic.by.ru

**КНІГІ**

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск; электронны адрас: exlibris@tut.by; вэбсайт: http://www.knihi.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новыя кнігі**: Беларускі кнігазбор, т.28: Васіль Быкаў. Выбраныя творы; Беларускі кнігазбор, т.25: Адам Міцкевіч. Выбраныя творы; «Новы Запавет» у перакладзе Ул.Чарняўскага; «Дзеяслоў» №9 (2); Сэкара Орджэй, «Кніжка Ферды Мураша». Т.: 8-029-643-57-33; exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай. Новыя CD**: «Я люблю ліцэй: Веру ў цябе!», «N.R.M. Spravazdača 1994-2004 Silver», «Пасадзіў DEAD RAPку — RAP NOT DEAD», «Б.Н. Не трывай», «Генэралы айчыннага року». Т.: 8-029-643-57-33; exlibris@tut.by

**Шырокі выбар** беларускіх кніг, CD, аўдыё, відэа ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00

**Прадам** старыя нумары «Arche», Л.Юрэвіч «Жыцьцё пад агнём», С.Ёрш «Вяртаньне БНП». Т.: 262-82-56

**ПРАЦА**

**Юрысконсульт**, стаж працы 9 гадоў, шукае працу па сумяшчальніцтве. Т.: 213-77-58. Аляксандар

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. Юрась. Т.: 235-18-72 (пасьля 17-й)

### Адказ на шахматную задачу з «НН» №21:

1...Tc6, і пагроза 2...Td8 фатальная для белых. Каб ня страціць фэрзя, ім давялося б аддаць каня (2. Kb5). У партыі было 1...Фb6? 2. Kpg2? Tc6! і чорныя ўсё-такі выйгралі фэрзя і партыю.

ВАКАНСІІ

## «Наша Ніва» запрашае

спэцыяліста па абслугоўваньні кампутарнай сеткі на трацціну стаўкі. Пажаданыя рэкамэндацыі.

**Зьвесткі пра сябе дасылаць на адрас nn@promedia.by**

## Незалежны культурны часопіс «ARCHE»

шукае на пастаянную працу дызайнэра-афарміцеля вокладак.

Патрабаваньні да кандыдатаў:
— мастацкая адукацыя;
— дасканалае валоданьне праграмамі «Adobe Photoshop» і «Coreldraw»;
— крэатыўнасьць;
— беларускамоўнасьць.

Наяўнасьць рэкамэндацыяў вітаецца.

**Просьба дасылаць рэзюмэ на адрас arche@arche.org.by з пазнакай у полі тэма — «конкурс».**

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3525. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 9.06.2004.
Замова № 3463.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а